Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЖНІВЕНЬ 3 1932 г. № 172 (4424).

Год выданьня XV

Пралетары ўсіх краеў, злучайцес

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Нарастаньне рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі. ВЕРЖБАЛОВІЧ—Салдацкія лісты (2 стар.).

АБ 15-ЦІГОДЗЬДЗІ «ЗЬВЯЗДЫ» і 5-ЦІГОДЗЬДЗІ ПЕРАХОДУ ЯЕ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ—З пастановы ЦК КП(б)Б. (1 стар.).

Поўным выкананьнем пляну сенаўборкі створым моцную кармовую базу для сацыялістычнай жывёлагадоўлі (1 стар.).

Працоўным краіны юбілей «Зьвязды» сустракаюць павышэньнем вытворчай актыўнасьці, чырвонымі абозамі, ростам падпіскі (2 стар.).

Барацьба за тэмпы вырабу і якасьці прадметаў шырокага спажываньня—адна з асноўных задач кожнай вытворчай партарганізацыі (3 стар.).

Ліквідацыя абязьлічкі рамонту і догл... забясьпечыць уздым вагоннай гаспэд... (3 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Вялікая перамога кампартыі Герма... (4 стар.).

Мытная блёкада ў Манчжурыі (4 стар.

Нарастаньне рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі

Выбары 31 ліпеня пацьвердзілі, што рэвалюцыйны ўздым у Германіі нарастае шпаркімі тэмпамі. У надзвычай вастраной унутранай і міжнароднай абстаноўцы, ва ўмовах тэрору і цкаваньня, рэвалюцыйная партыя германскага пралетарыяту атрымала **5,3 млн. галасоў**, г. зн. амаль на 700.000 галасоў больш, чым на выбарах у рэйхстаг у 1930 г. А калі супаставіць вынік выбараў у рэйхстаг з другім турам прэзыдэнцкіх выбараў у красавіку 1932 г., дык аказацца, што кампартыя завявала новых **1.570.000 галасоў**.

Да часу апошніх выбараў у рэйхстаг крызіс надзвычай абвастрыўся. У верасьні 1930 г. ён толькі разгортваўся, а зараз ён дасягнуў страшэннай глыбіні. Колькасьць беспрацоўных раўняецца 6,7 млн. Даход германскага рабочага зьменшыўся амаль напалову. Германія перажыла востры выбух крэдытнага крызісу летам 1932 г. і фактычнае банкрутства буйнейшых банкаў, — банкрутства, якое ўдалося прыкрыць толькі сотнямі мільёнаў дзяржаўных субсыдый.

На гэтым фоне паглыбленьня крызісу і зьбяднеьня мас адбывалася рэзкае абвастрэньне клясавай барацьбы. На ўрад Брюнінга і была ўскладзена задача наступовага ажыцьцяўленьня фашысцкай дыктатуры. Надзвычайныя дэкрэты зьніжалі сацыяльнае страхаваньне і зарплату рабочым, накладвалі на працоўных цяжар новых падаткаў шляхам мытаў, штучна ўздымалі цэны на сельска-гаспадарчыя прадукты.

Абвастрэньне клясавых супярэчнасьцяй прывяло да росту фашызму з аднаго боку, посьпехаў камуністаў — з другога. Дробная буржуазія, зруйнаваная крызісам, кінулася ў абдымкі фашызму, думаючы, што здаўсёвая трэцяя імпэрыя забясьпечыць ёй зварот даваеннага дабрабыту і зьнішчэньне версальскіх ланцугоў. Таксама частка беспрацоўных падпала пад уплыў фашысцкіх дэмагогаў. Разам з тым адбываўся рост уплыву кампартыі. Гэты рост адбываўся нероўнамерна. Нарасталі прадпасылкі рэвалюцыйнага крызісу. Урад фон-Папэна зацяў месца ўраду Брюнінга для таго, каб узмацніць тэрор супроць рабочай клясы, зьнішчыць яе супраціўленьне наступленьню капіталу, шырока адчыніць дзьверы фашысцкай дыктатуры, ажыцьцявіць фашысцкі пераварот у Прусіі.

Выбары ў рэйхстаг адбываліся і ў іншай міжнароднай абстаноўцы, пасьля Лёзанны і Жэнэвы, ва ўмовах рэзкага абвастрэньня імпэрыялістычных супярэчнасьцяй. Германская буржуазія прабавала выкарыстаць міжнародную абстаноўку, што склалася да 31 ліпеня, для таго, каб рашуча перацягнуць на свой бок шалькі вагі ў выбарчай барацьбе. Выступленьне Шлейхэра, Папэна і інш., распальваньне нацыяналістычных і шавіністычных настрояў, — усё было скарыстана буржуазіяй для ашуканьня пралетарыяту і працоўных мас.

Вынікі выбараў даказваюць, што масы спму-таму навучыліся за гэты час, што яны вырасьлі.

Урок прэзыдэнцкіх выбараў не прапаў даремна. Выбары паказваюць, што камуністычная партыя, якая вядзе барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры за падзенныя інтарэсы рабочай клясы, **становіцца кіраўніком усё больш шырокіх мас германскага пралетарыяту.** Трэць германскага прамысловага пралетарыяту галасавала супроць фашысцкага тэрору і капіталізму. Трэць германскіх прамысловых рабочых галасавала супроць Вэйнмарскай рэспублікі і «трэцяй імпэрыі» Гітлера. **Трэць германскага пралетарыяту галасавала за кампартыю, за сацыялістычную савецкую Германію, за рэвалюцыйны выхад з крызісу.** Разам з гэтай трэцяй часткай прамысловых рабочых за кампартыю галасавалі сотні тысяч сельска-гаспадарчых рабочых, бяднейшых сялян і служачых, якія прызнаюць камуністычную партыю сваім кіраўніком. Гэты выбарчы посьпех КПГ мае буйнейшае міжнароднае значэньне. Ён паказвае, што **сілы германскай рэвалюцыі растуць і мацнеюць.**

Але разам з тым, уплыў фашыстаў яшчэ не зламаны. Партыя нацыянал-сацыялістаў атрымала 13.732 тысячы галасоў, а саюзная з'ёю партыя нямецкіх нацыяналістаў—2.174.000 галасоў. Гэта дае буржуазіі моцную зброю супроць рабочай клясы. Рост нацыянал-сацыялістаў — гэта перш за ўсё **выражэньне канцэнтрацыі сіл буржуазіі для барацьбы супроць пралетарыяту.**

Мы ўжо ўказвалі ў сувязі з прэзыдэнцкімі выбарамі, што нацыянал-сацыялістам пя доўга ўдасца ўтрымаць гэтым сваіх рабочых у сваіх радох. Зараз мы ўжо можам адзначыць ня толькі стабілізацыю колькасьці галасоў нацыянал-сацыялістаў у значнай частцы рабочых раёнаў (Дзюсэльдорф, Усходняя і Южная Вэстаралія, Аахэн, Бэрлін), але і адліў ашуканых рабочых, які ўжо пачаўся.

Ня менш важнай з пункту погляду пэрспэктыў клясавай барацьбы супроць буржуазіі зьяўляецца тая акалічнасьць, што кампартыі ўдалося адвяваць у сацыял-дэмакратаў сотні тысяч рабочых выбаршчыкаў і ўключыць іх у фронт рэвалюцыйнай барацьбы. Кампартыя на гэтых выбарах атрымала прыблізна столькі-ж рабочых галасоў, колькі атрымала сацыял-дэмакратыя. Разам з тым у большасьці асноўных рабочых раёнаў (Бэрлін, Южная Вэстаралія, Дзюсэльдорф, Галле-Марээбург і г. д.) яна стала мацнейшай за сацыял-дэмакратыю, а ў некаторых з гэтых раёнаў і мацнейшай за нацыянал-сацыялістаў.

Умацаваўшыся ў асноўных раёнах у якасьці найбольш магутнай партыі германскага пралетарыяту, КПГ разам з тым значна ўзмацніла свой уплыў на вёсцы. Сілы германскага пралетарыяту мацнеюць. Сацыял-дэмакратыя выразна адчувае, што набліжаецца яе закат. Але іменна ў гэтых умовах будзе наступаць з усё ўзрастаючай сілай. Буржуазія будзе прабаваць яшчэ больш шпаркімі тэмпамі замацоўваць і пашыраць свой пераход да мэтадаў адкрытай фашысцкай дыктатуры, умацоўваць тэрарыстычны рэжым, створаны 20 ліпеня. Таму, іменна зараз германскія камуністы з яшчэ большай энэргіяй будуць працягваць мабілізацыю мас для рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашызму, каб поўнасьцю скарыстаць цяперашнюю хвалю магутнага рэвалюцыйнага ўздыму ў Германіі для ўмацаваньня сваіх пазыцый.

Кіруючыя колы германскай буржуазіі распусьцілі рэйхстаг і абвясьцілі перавыбары для таго, каб урад Папэна-Шлехэра змог атрымаць парляманцкую большасьць. Ён гэтай большасьці не атрымаў. Разгалосьсі ўнутры германскай буржуазіі настолькі сур'ёзныя, што і пасьля гэтых выбараў урад Папэна апіраецца на парлямант ня зможа. Гэта паказвае, што буржуазія і далей, з каго-б не складаўся ўрад пасьля выбараў, павінна будзе кіраваць у асноўным баз рэйхстагу, пры дапамозе надзвычайных дэкрэтаў Гіндэнбурга. Рэйхстаг, калі ён і ня будзе распушчаны, вярней за ўсё будзе служыць толькі фірмай для захаваньня «дэмэкратыі», палітыцы зьніжэньня заработнай платы і дапамогі беспрацоўным, далейшага скасаваньня яшчэ пакуль што не скасаваных пунктаў вэймарскай канстытуцыі.

Выбары выкрылі толькі паскарэньне працэсаў расхістваньня сыстэмы палітычнага панаваньня буржуазіі. Сацыял-дэмакратыя ўгаварала масы не пераходзіць да мэтадаў рашучай клясавай барацьбы супроць фашызму, а чакаць вынікаў выбараў. Але вось выбары адбыліся. Што-ж далей? Вось пытаньне, якое задае сабе і свайму кіраўніцтву кожны с.-д. рабочы.

На выніках 31 ліпеня рабочыя масы яшчэ раз упэўніліся, што выбарчым бюлетэнем нельга адбіць наступленьне фашызму. Камуністычная партыя напружвае ўсе сілы да разгортваньня рэвалюцыйных выступленьняў супроць фашызму і капіталізму, каб гэтым паскорыць адыход мас ад сацыял-дэмакратыі, узьняць барацьбу мас на больш высокую ступень, мабілізаваць іх волю і рашучасьць да барацьбы за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

(«ПРАВДА»).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Пачынаецца будаўніцтва першай волскай гідрацэнтралі

НІЖНІ ПОЎГАРАД. Ніжагародзкі край становіцца арэнай будаўніцтва першай волскай гідрацэнтралі. Канчаткова выбрана месца пабудовы **Балахінскай ДЗС на адлегласьці 75 клм. ад Ніжняга—крыху вышэй гардну, каля вёскі Васільлева.**

ДЗС будзе даваць 20 тыс. клв. і павінна быць закончана і пушчана ў эксплёатацыю ў 1935 годзе. Для будаўніцтва патрэбна будзе вялізарная колькасьць толькі адных мясцовых будматар'ялаў. Напрыклад, гравія патрабуецца 2 млн. кбм., пяску—1 млн. кбм., булыжнага каменю—1 млн. кбм. і г. д.

Будаўніцтва пачнецца ў жніўні з тым разьлікам, каб скарыстаць зіму для пабудаваньня перамычак на рэчцы.

Кузьнецкбуд ідзе да новай перамогі

СТАЛІНСК. Адбыліся выпрабаваньні завалачнай машыны мартэнаўскага цэху. Выпрабаваньні далі бліскучыя вынікі. За 15 мінут пры рабоце аднаго машыніста печ загружае 7,5 тон сырцу.

Цэх узмоцнена ідзе да пуску. Працуюць усе краны. Шыборы на газаправодах устаноўлены. Закончана футэроўка. Канчаюцца работы па вадаправоду ўнутры цэху.

Сельгасмашыны

ГОМСЕЛЬМАШ 23 ліпеня зрабіў 32 сіласарэзкі «Папэк», што складае 133 проц. дзённага заданьня, 10 сячкарань — 62,5 проц., 7 бульбасартовак — 43,7 проц. і 13 канюшнасартовак—**325 проц.**

25 выпушчана 26 сіласарэзак «Папэк» —108,3 проц., 16 сячкарань—100 проц., і 6 бульбасартовак—37,5 проц.

26—37 сіласарэзак «Папэк»—125 проц., 10 сячкарань—62,5 проц. і 13 бульбасартовак—80 проц., і 27-га—26 сіласарэзак «Папэк»—108,3 проц., 16 сячкарань—100 проц., 16 бульбасартовак—100 проц., і 2 канюшнасартоўкі—50 проц.

На БелДРЭСЕ

1-я БелДРЭС імя Сталіна за 25 ліпеня выпрацавала [illegible] тыс. клв-гадзін электраэнэргіі, што складае 85 проц. дзённага пляну: максымум дасягнуў 7.500 клв. 26-га —150 тыс. клв. дзённа—бо 91,5 проц., максымум раўняўся 8.250 клв.

Аб 15-цігодзьдзі „Зьвязды" і пяцігодзьдзі пераходу яе на беларускую мову

З пастановы ЦК КП(б)Б

10 жніўня 1932 г. спаўняецца 15 год са дня заснаваньня органу ЦК КП(б)Б «Зьвязды» і 5-цігодзьдзе пераводу яе на беларускую мову.

ЦК КП(б)Б надае вялікае палітычнае значэньне гэтаму юбілею і прапануе гаркомам і райкомам КП(б)Б зрабіць юбілей справай усёй партыйнай арганізацыі і пралетарскай грамадзкасьці, справай усяго друку БССР, надаўшы юбілею масавы палітычны характар.

Асноўнымі палітычнымі ўстаноўкамі ў правядзеньні юбілею і яго задачамі павінна быць наступнае:

1. Неабходна адзначыць вялікае значэньне і заслугі «Зьвязды», як органу ЦК КП(б)Б, якіх яна дабілася пад кіраўніцтвам КП(б)Б, а таксама пры непасрэднай дапамозе і кіраўніцтве ЦО «Праўда» ў барацьбе за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за няўхільнае правядзеньне ленінскай нацыялітыкі. Адзначыць заслугі і значэньне «Зьвязды» ў часы грамадзянскай вайны, у аднаўленчы пэрыяд, і ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Неабходна асабліва падкрэсьліць, што «Зьвязда» на працягу ўсяго часу свайго існаваньня была і ёсьць вастрэйшай зброяй партыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, у барацьбе з клясавым ворагам і яго агэнтурай, апартуністамі ўсіх колераў і прымірэнцамі, была зьвязана з самымі шырокімі працоўнымі масамі, якія прымаюць актыўны ўдзел ва ўсёй рабоце «Зьвязды».

2. Галоўная ўвага партыйных, грамадзкіх арганізацый і ўсяго друку пры правядзеньні юбілею павінна быць сканцэнтравана на павышэньні тэмпаў і якасьці работы па выкананьні задач, якія стаяць перад КП(б)Б у справе выкананьня праграмы чацьвертага заключнага году пяцігодкі і па разгортваньні шырокай падрыхтоўчай работы да выкананьня сусьветна-гістарычнага значэньня задач, пастаўленых партыяй у 2-й пяцігодцы. Юбілей павінен працівіцца пад знакам няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, разгортваньня барацьбы з клясавым ворагам і яго агэнтурай унутры партыі—правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да ўхілаў ад лініі партыі.

3. Асаблівую ўвагу пры правядзеньні юбілею трэба зьвярнуць на павышэньне тэмпаў нацыянальна-культурнага будаўніцтва, на барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам—галоўнай небясьпекай, з мясцовымі шавінізмамі і ўсімі скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі, на барацьбу за ўмацаваньне беларусізацыі.

У прыватнасьці на прадпрыемствах, саўгасах і калгасах павінна быць шырока разгорнута работа па далейшым умацаваньні беларусізацыі і ўзьнёсьці яе на вышэйшую ступень, па ленінскім абслугоўваньні працоўных нацменшасьцяй на іх роднай мове.

4. На прадпрыемствах шырока разгарнуць самаабвязацельствы рабочых па выкананьні прамфінпляну на падставе няўхільнага ажыцьцяўленьня 6-ці ўказаньняў **т. Сталіна**, па выкананьні задач вырабу і прасоўваньні тавараў шырокага спажываньня, па далейшым паляпшэньні матар'яльна-бытавых умоў рабочай клясы, па разгортваньні савецкага гандлю.

5. Значна ўмацаваць работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, сканцэнтраваўшы ўвагу на выкананьне задач, акрэсьленых пастановамі партыі ў гэтай галіне; рашуча павысіць увагу пытаньням сельскай гаспадаркі, найбольш шырока разгарнуць падрыхтоўку да прагледзеньня надыходзячай загатоўчай кампаніі, правёўшы з найменшымі стратамі ўборку ўраджаю; рашуча разгарнуць гандаль, выкрываючы ўсе скажэньні лініі партыі ў гэтай галіне;

а) узьняць на яшчэ большую вышыню марксыцка-ленінскае выхаваньне тычны ўзровень членаў КП(б)Б і шырокіх працоўных мас; рашуча перабудаваць ганізацыйную і масава-палітычную работу на аснове апошніх дырэктыў ліпеньскі пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б; дабіцца няўхільнага выкананьня дырэктыў партыі і ўрэ аб рэвалюцыйнай законнасьці, прыцягваючы да суровай адказнасьці ўсіх тых, і іх парушае;

б) правядзеньне юбілею арганізаваць з выкрыцьцём недахопаў у раб як самой «Зьвязды», так і ўсяго друку БССР, і з далейшым значна большым умацаваньнем сувязі друку з масамі (прадпрыемствамі, саўгасамі, МТС, калгасамі), з ліпшэньнем якасьці ўсіх зьвеньняў пралетарскага друку і з няўхільным разгортваньнем пралетарскай самакрытыкі, з барацьбой за яе дзейснасьць; за рашучую перабудову ў бок канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва, праверку выкананьня дырэктыў;

в) юбілей «Зьвязды» цесна зьвязаць з павышэньнем увагі з боку шырокіх працоўных мас да пытаньняў міжнароднай палітыкі і міжнароднага становішча Савецкага Саюзу, да большага ўцягненьня шырокіх мас працоўных у работу па ўзмацненьні абароназдольнасьці савецкай краіны; юбілей павінен таксама значна садзейнічаць большаму азнаямленьню працоўных мас Савецкай Беларусі з рэвалюцыйнай барацьбой працоўных мас Польшчы і Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам брацкай кампартыі, з выкрываньнем здрадніцкай ролі сацыял-фашыстаў і беларускіх нацыянал-фашыстаў на Заходняй Беларусі.

У якасьці практычных задач пры правядзеньні юбілею ЦК КП(б)Б намячае наступнае:

1. Арганізаваць усебеларускі рэйд ударных брыгад усяго друку імя юбілею «Зьвязды» па пытаньнях уборачнай кампаніі і разгортваньня вырабу тавараў шырокага спажываньня.

2. На пашыраных пленумах з партактывам гаркомаў і райкомаў Менску, Віцебску, Гомелю, Барысаву, Магілеву, Бабруйску, Слуцку, Рэчыцы, Воршы і Полацку сумесна з рабкорамі-ўдарнікамі, працаўнікамі газэт паставіць даклады аб юбілеі «Зьвязды». Таксама заслухаць даклад на заводах: імя Ланцуцкага, «Чырвоны ...таліст», Барысаўскім запасным камбінаце «Бальшавік», дэпо ст. Ворша. Адна... сова паставіць даклады рэдакцыі ў адным калгасе Слуцкага раёну, саўгасе Капыльскага раёну і ў адным з пагранічных атрадаў. Дакладчыкаў даручыць зацьвердзіць Культпропу ЦК.

3. Выслаць групу работнікаў для разгортваньня масавай работы вакол юбілею «Зьвязды» ў наступныя раёны: Мазырскі, Дзяржынскі, Крычаўскі, Дрысенскі, Гомельскі і Лепельскі.

4. Прапанаваць рэдакцыі «Зьвязды» да юбілейнага нумару апублікаваць рад нарысаў па гісторыі і сучаснай рабоце «Зьвязды», у якіх адзначыць, як дасягненьні, так памылкі і недахопы «Зьвязды».

5. Рэдакцыі «Зьвязды» арганізаваць да 15-цігодзьдзя выстаўку, якая паказала б змаганьне газэты «Зьвязда» на розных этапах яе існаваньня.

Поўным выкананьнем пляну сенаўборкі створым моцную кармовую базу для сацыялістычнай жывёлагадоўлі

ЧОРНАЯ ДОШКА

За ганебныя тэмпы па сенажацях, за зрыў тэрмінаў сенаўборкі, за няўменьне мабілізаваць масы калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў на стварэньне кармовай базы, пакідаем на чорнай дошцы наступныя раёны:

Па паўднёвай зоне:

1. **Брагінскі**—14,7 проц., 2. **Гомельскі**—24,1 проц. і 3. **Мазырскі**—35,7 проц.

Па цэнтральнай зоне:

1. **Горацкі**—20,9 проц., 2. **Прапойскі**—28,9 проц.

Па паўночнай зоне:

Чашніцкі—39,1.

За апартуністычныя тэмпы сенаўборкі дадаткова заносім на чорную дошку наступныя раёны, якія за апошнія 5 дзён не дабіліся амаль ніякага приросту:

1. **Ельскі**—22,4 проц., 2. **Камарынскі**— 35 проц. (пры 47,5 проц. па паўднёвай зоне), 3. **Асіпавіцкі**—38,2 (пры 66,5 проц. па цэнтральнай зоне), 4. **Гарадоцкі**—33 проц., 5. **Асьвейскі**—38 проц. (пры 56,5 проц. па паўночнай зоне).

Зьнімаюцца з чорнай дошкі

За ліквідацыю адставаньня ў сенаўборцы зьнімаюцца з чорнай дошкі наступныя раёны:

1. **Чачэрскі** раён (64,7 проц.), які за апошнюю пяцідзённку па паўднёвай зоне вышаў з 25 на 5 месца і даў за 5 дзён павялічэньне пляну на 53,9 проц.
2. **Жлобінскі** раён (55,4 проц.), які па паўднёвай зоне вышаў з 20 на 8 месца.
3. **Уваравіцкі** (48,1 проц.), які па паўднёвай зоне вышаў з 25 на 15 месца.
4. **Рэчыцкі** (40,2½ проц.), які па паўднёвай зоне вышаў з 26 на 20 месца.
5. **Чырвонаармейскі** (59,4 проц.), які па цэнтральнай зоне вышаў з 30 на 24 месца.
6. **Быхаўскі раён** (82 проц.). Па цэнтральнай зоне вышаў з 31 на 8 месца.
7. **Сураскі** (66,1 проц.), які па паўночнай зоне вышаў з 14 на 5 месца.

Раёны, якія зьнімаюцца з чорнай дошкі, не аслабляючы, а яшчэ больш узмацняючы тэмпы касьбы, у бліжэйшую пяціднёўку павінны прыйсьці да канчатковых перамог на сенажацях, са 100 проц. выкананьнем пляну сенаўборкі.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

За поўнае выкананьне пляну сенаўборкі, за ўдарныя тэмпы на сенажацях заносім на чырвоную дошку:

1. **Менскі раён** (100 проц. выкананьне пляну).

КАНДЫДАТЫ НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

У сьпіс кандыдатаў на чырвоную дошку застаюцца:

Вузьдзенскі раён — 84,7 проц., **Смалявіцкі** — 84,4 проц., **Пухавіцкі** — 83, проц., **Чэрвеньскі** — 82,5 проц., **Заслаўскі** — 82,3 проц., **Бярэзінскі** — 80,5 проц **Клімавіцкі** — 80,2 проц., **Бялыніцкі** — 73,3 проц., **Лагойскі** — 77,6 проц., **Церахаўскі** — 72 проц., **Аршанскі** — 84,6 проц., **Лёзьнянскі** — 76,4 проц., **Чавускі** — 71, проц. і **Бабруйскі** — 66 проц.

Дадаткова заносім у сьпіс кандыдатаў на чырвоную дошку:

Буда-Кашалёўскі раён — 75,7 проц., **Барысаўскі**—84,4 проц., **Быхаўскі**—82 проц. **Віцебскі** — 73 проц.

За аслабленьне тэмпаў па сенажацях зьнімаецца з кандыдатаў на чырвоную дошку **Рагачоўскі раён**, які за апошнія пяць дзён ня даў ні аднаго процанту приросту.

ЗВОДКА НКЗБ

аб уборцы натуральных сенажацяй па БССР на 1 жніўня 1932 г.

№№ па ч.	НАЗВА РАЁНАЎ	План у гэкт.	Скошана у проц. да пляну	Зьвезена ў проц. да скошанага
	ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА:			
1.	Буда-Кашалёўскі	15.764	75,7	—
2.	Церахаўскі	23.854	72,0	90,5
3.	Бабруйскі	32.259	66,0	96,5
4.	Тураўскі	17.546	65,7	86,8
5.	Чачэрскі	14.250	64,7	—
6.	Парыцкі	36.255	62,4	86,3
7	Рагачоўскі	32.451	58,7	68,2
8.	Жлобінскі	28.750	55,4	79,9
9.	Нараўлянскі	19.849	55,3	87,4
10.	Веткаўскі	25.533	53,8	—
11.	Глускі	42.165	53,6	71,6
12.	Любаньскі	21.740	52,8	78,3
13.	Лельчыцкі	18.100	49,6	79,0
14.	Старобінскі	87.140	49,2	97,0
15.	Ўраравіцкі	21.070	48,1	50,1
16.	Лоеўскі	22.030	47,8	—
17.	Кармянскі	13.250	42,4	79,4
18.	Пятрыкоўскі	47.540	42,4	77,0
19.	Хойніцкі	33.625	40,8	91,3
20.	Рэчыцкі	45.950	40,2	—
21.	Жыткавіцкі	17.138	39,2	—
22.	Мазырскі	50.266	35,7	78,8
23.	Камарынскі	20.262	35,0	—
24.	Гомельскі	29.468	24,1	64,1
25.	Брагінскі	29.879	14,7	—
26.	Ельскі	23.958	22,4	77,8
	Усяго па зоне:	720.094	47,5	65,9
	ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗОНА:			
1.	Менскі	9.971	116,3	100,0
2.	Вузьдзенскі	12.870	84,7	91,9
3.	Смалявіцкі	11.576	84,4	100,0
4.	Барысаўскі	22.507	84,4	83,3
5.	Пухавіцкі	45.870	83,2	93,4
6.	Чэрвеньскі	18.331	82,5	100,0
7.	Заслаўскі	9.000	82,3	96,1
8.	Быхаўскі	27.252	82,0	87,3
9.	Бярэзінскі	17.905	80,5	95,5
10.	Клімавіцкі	28.700	80,2	96,4
11.	Бялыніцкі	15.072	79,3	—
12.	Лагойскі	12.850	77,6	100,0
13.	[illegible]	[illegible]	76,7	100,0
14.	Чырвонаармейскі	10.755	74,2	93,1
15.	Шклоўскі	18.316	73,7	91,0
16.	Койданаўскі	14.729	73,2	97,3
17.	Мсьціслаўскі	18.566	72,1	79,9
18.	Чэрыкаўскі	10.879	71,8	37,8
19.	Чавускі	21.956	71,7	96,6
20.	Магілеўскі	21.165	71,5	87,8
21.	Бялынічскі	11.547	70,7	73,0
22.	Капыльскі	22.473	66,8	87,8
23.	Крупскі	32.307	62,4	—
24.	Чырвонапольскі	24.611	59,4	87,8
25.	Старадарожскі	21.771	59,4	76,9
26.	Крычаўскі	9.739	56,9	—
27.	Клічаўскі	20.440	55,2	96,9
28.	Слуцкі	41.965	53,9	70,2
29.	Талочынскі	26.134	48,2	85,4
30.	Касьцюковіцкі	29.575	44,8	99,5
31.	Асіпавіцкі	16.823	38,2	—
32.	Прапойскі	15.870	28,9	73,7
33.	Горацкі	29.060	20,9	95,5
	Разам па зоне:	162.831	66,5	80,3
	ПАЎНОЧНАЯ ЗОНА:			
1.	Аршанскі	29.151	84,6	82,8
2.	Лёзьнянскі	35.837	76,4	94,5
3.	Віцебскі	24.847	73,0	85,9
4.	Вушацкі	24.102	68,7	—
5.	Сураскі	40.073	66,1	94,9
6.	Сіроцінскі	29.400	61,3	99,7
7.	Бешанковіцкі	28.932	57,7	96,7
8.	Расонскі	21.344	56,0	96,2
9.	Полацкі	44.281	55,8	89,9
10.	Лепельскі	24.874	51,7	97,4
11.	Дрысенскі	19.084	50,0	86,9
12.	Дубровенскі	18.045	49,6	89,2
13.	Сенненскі	30.741	45,9	—
14.	Чашніцкі	24.041	39,1	22,3
15.	Асьвейскі	12.274	38,0	73,4
16.	Гарадоцкі	60.004	33,0	78,5
	Разам па зоне:	467.631	56,5	77,6
	Усяго па БССР:	1.850.556	55,6	74,9

ЗАУВАГА: Зводка складзена па 61 раёну на 1 жніўня. Па 14 раёнах [illegible]

Апрацоўкаю НКЗБ — ТАРАСЕВІЧ.

26 ударных дзён калгасу „Баявік"

Дзед Васіль, з гіранічнай усьмешкай на твары, запытаў:

— Ты чытаў «Зьвязду»?

— Аб чым?

У Тураве-ж дзесяткі тысяч га сенажаці чакаюць касцоў...

— Ну і што?

— А вось што, там 40 калгаснікаў касілі 10 га сенажаці 2 тыдні. Васіль паглядзіў сваю рэдкую бараду, прыжмурыў адно вока і дадаў:—Камандыруйце мяне туды, я ім пакажу, як трэба касіць...

Карпучок Васіль—калгасьнік перадавога буйнага калгасу Капыльскага раёну «Баявік». Дзед сыстэматычна сочыць за цэнтральным і раённым друкам, ад яго старых вачэй рэдка калі ўсьлізьне заметка аб калгасным будаўніцтве і міжнародных падзеях. Вось і зараз дзед абуран і ня можа абысьці факту зрыву ўборкі сенажаці калгасьнікамі Букчанскага калгасу, Тураўскага раёну.

Чаму-ж так? Таму, што калгасьнікі калгасу «Баявік» разам з дзесяткам такіх, як Карпучок Васіль, **сапраўды паказалі, як трэба змагацца за гаспадарчую моц свайго калгасу, як умела трэба расстаўляць сілы і арганізаваць работу.**

Вопыт ёнае работы калгасьнікі калгасу «Баявік і хочуць зараз перадаць адстаючым калгасам БССР і асабліва калгасам Тураўскага раёну, якія зрываюць сенаўборку.

«У калгасе «Баявік» было 375 га балотнай сенажаці і 30 га мурагу. Уся гэта плошча ў пачатку работы была разьбіта на 8 вучасткаў і замацавана за 8-мі групамі. Касьбу калгас распачаў 24 чэрвеня. З самага-ж пачатку работы групы разгарнулі паміж сабой сацыялістычнае спаборніцтва. Норма 0,33 га па касцы з першых-жа дзён перавыконвалася. Кожны лічыў і лічыць зараз для сябе ніжэй выпрацаваць за дзень работы толькі адзін працадзень.

[illegible] дзі прыблізна аднолькавай сілы. Да рэчы можна прывесьці групу **Цьвірко** Кастуся паказаць на канкрэтных прыкладах яе работу.

Група Цьвірко з самага пачатку касьбы адставала ад рэшты груп. Прычынай быў меншая колькасьць касцоў, чым у астатніх групах. Але сацыялістычныя мэтады працы прымусілі групу напружыць усе сілы дагнаць астатнія. Гручавод Кастусь Цьвірко ставіць на сходзе групы пытаньне аб скарыстаньні ўсіх выходных дзён для касьбы. Работа закіпела, працавалі бяз усякіх выходных дзён і, як дзед Васіль кажа:

— Касілі ад сонца да сонца... Балота аж стагнала пад нашымі касамі...

Карпучок Васіль таксама ўваходзіць у групу Цьвірко. Яго каса пражыла ўжо з ім некалькі год, але Васіль яе шануе—ёй ён перавыконвае норму ў 2-2,5 раз.

Ударную работу групы можна яшчэ ілюстраваць такімі момантамі:

Чатыры касцы групы: **Цьвірко Кастусь, Квач Васіль, Квач Пятрок і Давыдоўскі Васіль** раніцою занялі лаву ў 3 га сенажаці, якую да вечара скончылі касіць, выпрацаваўшы па 0,75 га замест нормы 0,33 га.

Вось другі факт: 20 мужчын і жанчын групы за дзень работы згроблі і склалі ў стагі 8-га сенажаці (норма 9 чалавек на га), выпрацаваўшы разам 72 працадні па кожны 3,6 працадня. Такія-ж тэмпы работы былі і ў групах Давыдоўскага Рыгора, Давыдоўскага Антона і астатніх.

Ударная работа 8 груп па ўборцы сенажаці забясьпечыла да пачатку ўборкі азімых скончэньне ўборкі 375 га балотнай сенажаці і 1 га мурогу. 20-га ліпеня група пераключ[illegible]ся на ўборку жыта і раньніх яравых.

Гаворачы аб калгасе «Баявік», нельга абмінуць і такога факту, як зьніманьне двох узводаў. У калгасе ўся прыгодная сенажаць пакінута для адрастаньня атавы [illegible]

Атава пойдзе на сілаж і на сена.

Ф. Вярэнуські.

Працоўныя краіны юбілей „Зьвязды“ сустракаюць павышэньнем вытворчай актыўнасьці, чырвонымі абозамі, ростам падпіскі

Пастановы правядзеньні 15-годзьдзя „Зьвязды“ і пяцігодзьдзя са дня пераводу яе на беларускую мову

Пастанова Сакратарыяту Менгаркому КП(б)Б

Вялікае палітычнае значэньне [illegible] юбілею «Зьвязды», Менгарком КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. З 1-га па 10-га жніўня на прадпрыемствах і ў калгасах правесьці масавыя гутаркі па тэму аб ролі і значэньні «Зьвязды» ў сацыялістычным будаўніцтве. Парадак правядзеньня гэтых гутарак і забесьпячэньня дакладчыкамі даручыць распрацаваць культпропу ГК.

2. Даручыць культпропу ГК правесьці канфэрэнцыю чытачоў «Зьвязды» на заводзе імя Варашылава і фабрыцы «Кастрычнік».

3. З 1-га па 10-га жніўня ў Менску і раёне сіламі рэдакцый цэнтральных, шматтыражных і насьценных газэт правесьці рэйд брыгад друку імя 15-цігодзьдзя «Зьвязды» па пытаньнях рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, разгортваньня вырабу тавараў шырпажыву, правядзеньня ўборачнай і абожжазагатоўчай кампаній. Адначасова па прадпрыемствах, саўгасах і калгасах у адзнаку 15-цігодзьдзя «Зьвязды» шырока разгарнуць збор рацыяналізатарскіх прапаноў, а таксама прыняцьце самаабавязацельстваў рабочымі і калгасьнікамі па пытаньнях выкананьня прамфінпляну і правядзеньня ўборачных работ. Адказным за правядзеньне гэтых мерапрыемстваў вылучыць т. Грыцкевіча.

4. У партдзень 7 жніўня правесьці адкрытыя партсходы, прысьвечаныя юбілею «Зьвязды».

5. З 10 па 20 жніўня арганізаваць у раёне ў гонар 15-цігодзьдзя «Зьвязды» чырвоныя абозы са збожжам новага ўраджаю.

6. Даручыць культпропу склікаць інструктыўную нараду рэдактароў нізавых газэт Менску па пытаньні правядзеньня нізавым друкам і рабселькорамі масавай работы ў сувязі з юбілеем «Зьвязды».

7. 10 жніўня склікаць урачысты пленум гаркому з парткалектывам, прысьвечаны юбілею «Зьвязды».

8. Даручыць фракцыі гарграфсавету арганізаваць 11-га жніўня ў садзе «Прафінтэрн» масавы вечар-гуляньне, прысьвечаны юбілею «Зьвязды».

9. Даручыць культпропу на аснове гэтай пастановы разаслаць у двухдзенны тэрмін інструкцыйны ліст ячэйкам КП(б)Б аб парадку правядзеньня юбілею «Зьвязды».

10. Даручыць культпропу ГК і бюро п-к. «Зьвязды» арганізаваць прэміяваньне старэйшых работнікаў друкарні «Зьвязды».

11. Лічыць неабходным у адзнаку юбілею «Зьвязды» надаць Грушаўскаму пасёлку, Беларэдтэхнікуму і Вышэйшаму пэдагагічнаму інстытуту імя «Зьвязды».

Кожны камуніст—падпісчык „Зьвязды“

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Віцебшчына ўключылася ва ўсебеларускі рэйд, абвешчаны Культпропам ЦК КП(б)Б, ЦКК, **«Зьвяздой»** і **«Рабселькорам»** імя 15-цігодзьдзя «Зьвязды».

30 ліпеня адбылося пасяджэньне бюро гаркому КП(б)Б, дзе распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньні рэйду.

Рэйд будзе праходзіць пад кутом погляду праверкі ажыцьцяўленьня 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, пасьняховага завяршэньня ўборкі ўраджаю, шырэйшага разгортваньня калгаснага гандлю і вырабу шырпажыву, барацьбы за захаваньне рэвалюцыйнай законнасьці, ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянітыкі, узмацненьне абароназдольнасьці краіны і поўнага ажыцьцяўленьня пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

Для павялічэньня тыражу «Зьвязды» райкомам высунут лёзунг — **«кожны камуніст, камсамолец павінен быць падпісчыкам «Зьвязды».** Для праверкі чытаньня і выпіскі «Зьвязды» ствараюцца спэцыяльныя брыгады, якія таксама будуць працаваць па шырэйшаму тыражу.

Для папулярызацыі гаспадарча-палітычнай дзейнасьці «Зьвязды» на бліжэйшых партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і рабочых сходах будуць пастаўлены даклады аб юбілеі «Зьвязды».

Гарком абавязаў рэдакцыю газэты «Віцебскі пралетары», шматтыражкі і насьценгазэты папулярызаваць юбілей «Зьвязды» на сваіх старонках, адзначыўшы яго яшчэ большай мабілізацыяй рабселькораў па барацьбу за генэральную лінію партыі і правядзеньне ўсіх гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў.

Для кіраўніцтва рэйдам створан штаб з 8 чал. У штаб уведзены прадстаўнікі гаркому партыі, рэдакцыі газэты «Віцебскі пралетары» ГарКК КП(б)Б, ГК КСМ, гарпрафсавету, гарсавету райкалгассаюзу.

9 жніўня склікаецца зьлёт рабкораў, парторгаў, прафоргаў, камсамольскіх арганізатараў і дэпутацкіх груп гарсавету, дзе будзе пастаўлен даклад на тэму: «Роля «Зьвязды» ў справе разгортваньня друку ў БССР».

Рэалізацыяй самаабавязацельстваў забясьпечым выкананьне прамфінпляну

(Ліст работніц і рабочых панчошнай ф-кі іма Клары Цэткін)

Лепшаму непрымірымаму змагару за генэральную лінію партыі, чыстату і адзінства бальшавіцкіх радоў, за ленінскую нацыянітыку, арганізатару шырокіх працоўных мас на бальшавіцкае выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва,—ЦО КП(б)Б «Зьвязьдзе» мы, работніцы і рабочыя Віцебскай панчошнай фабрыкі імя Клары Цэткін шлем шчырае пралетарскае прывітаньне.

Наша фабрыка ў 3-м квартале бягучага году значна аслабіла тэмпы сваёй работы. Плян першай паловы ліпеня па выпуску прадукцыі выканан усяго на 80,9 проц. Зараз уся наша ўвага накіравана на ліквідацыю адставаньня і ўзьнімцьце тэмпаў работы.

У адзнаку юбілею «Зьвязды» мы бярэм на сябе наступныя абавязкі. Разгарнуць бальшавіцкую прапрацоўку пастаноў ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б з тым, каб кожная работніца і рабочы нашай фабрыкі добра ведалі асноўныя задачы, высунутыя пленумам.

У мэтах лепшага выкарыстаньня адыдаў і больш хуткага фарсаваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, мы абавязваемся на працягу 3-х дзён ліквідаваць адставаньне ў гатым напрамку і прыняць усе меры да таго, каб вызначаная падатковая праграма па шырспажыву на 3-ці квартал у суме 43.140 руб. была-б поўнасьцю намі ажыцьцёўлена.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу на паляпшэньне культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых, дзеля чаго ўзмацніць грамадзкі кантроль над работай ЗРК, шляхам прымацаваньня пастаянных рабочых брыгад да пасобных зьвеньняў рабочага спажэньня (сталовых, сьвінарнікаў, трусатнікаў і інш). Давесьці ўкамплектаваньне трусатніка і сьвінарніка да 150 штук у кожным.

У мэтах ліквідацыі адставаньня ў выкананьні прамфінпляну, уцягнуць усе гаспадарча-разрахунковыя брыгады ў абвешчаны ўнутрызаводзкі конкурс на лепшую брыгаду. Прагулы і спазьненьні на работу зьвесьці да нуля, разгарнуўшы вялікую выхаваўчую работу з прагульшчыкамі.

Па барацьбе з бракам арганізаваць у цэхах і брыгадах дошкі і вітрыны браку з указаньнем канкрэтных винаватых дрэннай якасьці прадукцыі, адначасова шырока папулярызуючы лепшых ударнікаў якасьці.

Прыняць усе меры да ліквідацыі пра стояў машын, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасьць і свалчасовы рамонт.

Для дапамогі падшэфным калгасам ва ўборцы ўраджаю высылаць кожны выходны дзень ня менш 100 чалавек. Акрамя гэтага, вылучыць спэцыяльную брыгаду касцоў.

Павесьці вялікую работу па павялічэньні тыражу «Зьвязды», давёўшы яго да 400 экзэмпляраў.

З мэтай пасьпяховага выкананьня ўзятых на сябе абавязкаў і ліквідацыі адставаньня ў выкананьні прамфінпляну, мы ўключаемся ў агульна-гарадзкое спаборніцтва прадпрыемстваў Віцебшчыны на атрыманьне ганаровага сьцягу гаркому партыі і ва ўсебеларускі рэйд ударных брыгад друку імя 15-цігодзьдзя «ЗЬВЯЗДЫ».

Па даручэньні рабочых фабрыкі:

Дырэктар — ХАНІНА.
Парткалектыў — ЖУРАЎ.
Фабком — ГОЛЬДЗІНА.
Рэдкалегія шматтыражкі «Панчошніца» — ЗІШТЭЙН.
Работніцы-ударніцы—ВОЛАТАВА, САЛЕЙНІК, СКАБЛОВА, БРАГІНА, БРУК, ПІРАГІНА.

Чырвонымі абозамі са збожжам, сенам і гароднінай адзначаюць 15-гадовы юбілей „Зьвязды“

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

У адзнаку 15-гадовага юбілею «Зьвязды» і міжнароднага антываеннага дня калгасы імя Чырвонай арміі і т. Гамарніка 31 ліпеня здалі чырвонымі абозамі 28 цнт. гароднины. Калгасы «Барацьбіт», «Капачова», «Чырвоны ўдарнік» здалі 18 вазоў сена.

Зарубежны.

***

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

У гонар 15-гадовага юбілею «Зьвязды» калгасы Даўжанскага сельсавету, «Сілач», «Новы шлях», «Інтэрнацыянал», Чырвоны Ўсход» здалі чырвонымі абозамі 18 цнт. жыта.

***

КЛІМАВІЧЫ. (Па тэлеграфу).

У адзнаку юбілею Зьвязды» калгас «XII Кастрычнік» здаў 7 тон збожжа. **Выкананы гадавы плян загатовак сена.**

Меляшкевіч, Кавалёў.

***

КАМАРЫНА. (Па тэлеграфу).

Калгасы «Чырвоная Украіна», «Ніжні жнямповец», імя Чарвякова, «Чырвоны барацьбіт» арганізавалі чырвоны абоз, якім здана дзяржаве 8 тон жыта, 3 тоны сена і 5 тон гароднины.

У адказ на пастановы партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю **калгасьнікі абавязаліся свалчасова і поўнасьцю выканаць плян збожжазагатовак.**

Райкампарт—Жураўлёў.
Райзагатзбожжа — Майзлін.

***

ШУМІЛІНА. (Па тэлеграфу).

У выніку праведзенай масавай работы беднякамі і серадняками **адначасобнікамі арганізован чырвоны абоз,** якім здана (прадана) дзяржаве 120 тон сена, тры тоны збожжа новага ўраджаю.

Сакратар райкому партыі—**Сусенка.**
Старшыня райвыканкому — **Ражнеўскі.**

***

БЯРЭЗІНА. (Па тэлеграфу).

1 жніўня ў міжнародны антываенны дзень калгасы Бярэзінскага раёну чырвонымі абозамі здалі **10.207 кгр. збожжа.** Калгасамі «Пралетарская перамога», Машчанікага сельсавету, здана 1.165 кгр., імя Варашылава—1.600, імя Урыцкага—109 кгр., імя Калініна, Бяльчанскага сельсавету—1.272 кгр., «Колас»—601, імя К. Маркса, Высокагорскага сельсавету,—1.145 кгр. і г. д.

Сакратар райкому партыі — **Славін.**
Старшыня райкалгассаюзу — **Каардаш.**

***

НАРОЎЛЯ. (Па тэлеграфу).

Порадавыя калгасы «Зьвязда», «Уперад», «Прагрэс» здалі чырвонымі абозамі 4.000 кгр. збожжа.

Сакратар райкому — **Балцін.**
Старшыня райвыканкому — **Караська.**
Старшыня райсаюзу — **Каробка.**

***

ТУРАЎ. (Па тэлеграфу).

31 ліпеня калгасы Тураўскага раёну рас пачалі датэрміновую здачу збожжа. Здана каля 3.000 кгр.

Загатзбожжа.

Мантаж газ. „На штурм бездаронжна“, якая выдавалася вышэйной рэдакцыяй „Зьвязды“ і „Налектыўіста“ на 8 дарбудучастку.

Уключаюцца ва ўсебеларускі рэйд

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Барысаў уключыўся ва ўсебеларускі рэйд імя 15-цігодзьдзя **«Зьвязды».** У часе правядзеньня рэйду ва ўсіх прадпрыемствах, калгасах і саўгасах будзе наладжана праверка рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, вырабу прадметаў шырокага спажываньня і разгортваньня калгаснага гандлю.

Для кіраўніцтва работай створан раённы штаб у складзе прадстаўнікоў ГК КП(б)Б, РайКК, рэдакцыі газэты «Бальшавік Барысаўшчыны», РК ЛКСМБ, райпрафсавету і райкалгассаюзу.

Штабам выпрацаван канкрэтны плян работы. Да 5 буйнейшых прадпрыемстваў, пасобных саўгасаў і калгасаў прымацаваны прадстаўнікі штабу. Райкомам партыі даны дырэктывы парт'ячэйкам раёну і ўпаўнаважаным па правядзеньні ўборачнай кампаніі аб арганізацыі работы на мясцох па ўдзелу ва ўсебеларускім рэйдзе.

У горадзе праводзіцца пашыраная шарада рэдкалегій шматтыражак і насьцегазэт з удзелам рабкораў.

***

ДЗЯРЖЫНСК. (Па тэлеграфу). Рэдакцыі газэт — **«Ударнік Дзяржыншчыны»** і **«Штурмавік Дзяржыншчыны»** ўключыліся ва ўсебеларускі рэйд, прысьвечаны 15-цігодзьдзю існаваньня «Зьвязды». Для правядзеньня работы арганізован штаб. Пасланы 10 чал. з райпартактыву па прадпрыемствы, саўгасы і калгасы.

Сакрэтар РК КП(б) — ПУШЧЫН.
Рэдактар — РЫМАШЭЎСКІ.

***

ГЛУСК. (Па тэлегр.). Глускі раён уключыўся ў рэйд імя 15-цігадовага юбілею «Зьвязды». Для дапамогі мясцовым партыйным ячэйкам у арганізацыі рэйду мабілізавана 30 чал. рабочага, партыйна-камсамольскага актыву. Створан штаб пры рэдакцыі «Сьцяг калектывізацыі».

Райком партыі — ФОМІЧАЎ.
Рэдакцыя газэты — РАДЗІНСКІ.

***

ЦЕРАХАЎКА. (Па тэлеграфу). Церахаўскі раён уключыўся ў рэйд 15-цігодзьдзя «Зьвязды». Створан штаб. Пасланы ў раён 6 чал. для дапамогі па арганізацыі рэйду. Гэтымі днямі выяжджае ў вёску яшчэ некалькі чалавек.

РК КП(б)Б — СУРБА.
Рэдакцыя газэты.

***

У адзнаку пятнаццацігодзьдзя «Зьвязды» райбюро саюздруку, Аршанскага раёну, узяло на сябе абавязак выканаць кантрольныя заданьні на тыражу ў **3.500 экз.** На сёнешні дзень ужо праведзена падпіска на **3.200 экз. «Зьвязды».** Разгорнута шырокая работа па поўным выкананьні і перавыкананьні кантрольнай лічбы.

Пашкевіч.

УКЛЮЧЫЛІСЯ Ў РЭЙД

Швэйная фабрыка «Кастрычнік» уключылася ва ўсебеларускі рэйд імя 15-годзьдзя «Зьвязды».

На фабрыцы адбылася парада рабкораў, на якой прысутнічалі 60 чалавек. Актыўна прапрацаваны плян рэйду. Рабкоры разьбіліся на брыгады. Кожная брыгада атрымала пэўны вучастак па правядзеньні рэйду.

На гэтай парадзе рабкоры пастанавілі разгарнуць растлумачальную работу аб значэньні юбілею «Зьвязды». Кожны рабкор узяў на сябе абавязак уцягнуць у правядзеньне рэйду рабочых-ударнікаў.

Ч.

Да 15-годзьдзя „Зьвязды“

В. ВЕРЖБАЛОВІЧ

Салдацкія лісты

(„Зьвязда“ на Заходнім фронце)

Важнейшымі задачамі нашай партыі на Заходнім фронце ў справе падрыхтоўкі яго да пралетарскай рэвалюцыі і ўзброенага паўстаньня былі: падтрымаць стыхійны рост рэвалюцыйнасьці, арганізаваць і ўзначаліць рэвалюцыйных салдат, падарваць армейскую камандную іерархію, весьці прапаганду інтэрнацыяналізму і рэвалюцыйнага выхаду з вайны.

Вялікую ролю ў выраішэньні гэтых задач была заклікана адыграць **«Зьвязда»,** першы нумар якой выйшаў **27-га ліпеня 1917 г.** *).

«З выхадам «Зьвязды» пачаўся другі этап распаўсюджваньня бальшавіцкіх ідэй на Заходнім фронце. «Зьвязда» разносіць па акопах погляды партыі, «Зьвязда» ў яскравай форме прапагандуе ідэю ўлады Саветаў, рэвалюцыйнага выхаду з вайны і барацьбу з генэралітэтам і Керанскічынай. Пад гэтымі агітацыйнымі лёзунгамі пашыралася партыйная арганізацыя, распаўсюджваўся ўплыў яе на фронт, ствараючы там нашы партыйныя ячэйкі». (Кнорын).

З першага-ж нумару «Зьвязда» заваявала вялікую сымпатыю сярод салдацкіх мас. Сьведкамі гэтага былі сотні прывітаньняў, якія дасылаліся салдатамі сваёй «Зьвязьдзе», і тысячы ахвяраванняў, якія яны зьбіралі ў «жалезны фонд» «Зьвязды».

Арыштаваньня Керанскім за адмаўленьне ісьці ў наступленьне, салдаты, якія знаходзіліся ў Каланчоўскай гаўптвахце ў ліку 145 асоб, калектыўна прачытаўшы першы нумар «Зьвязды» на другі ўжо дзень прыслалі сваё прывітаньне, у якім яны ў вобразнай форме «жадаюць дарагой «Зьвязьдзе» расьсеяць, разьбіць гэту змрочную ноч (справа ідзе аб рэакцыі, якая разгортвалася на фронце пасьля няўдалага наступленьня) і каб хутчэй вышла не адна «Зьвязда», каб ня было гэтай панурай, цяжкай, рэакцыйнай ночы, каб усё неба было ў зьвёздах»...

Другія арыштаваныя салдаты з гаўптвахты армейскага камандзіта 10-ай арміі ў сваім лісьце вітаюць газэту «Зьвязда», «як адзіную выразьніцу нашай волі і абаронцу нашых інтарэсаў, якая заўсёды стаіць на варце свабоды і змагаецца з буржуазнымі газэтамі». Тут-жа пры гэтым лісьце салдаты прыклалі сваю «пасільную лепту»—13 р. у **«жалезны фонд»** газэты і заклікаюць «таварышоў салдат і рабочых паступаць па нашым прыкладзе, каб газэта «Зьвязда» сьвяціла яшчэ ярчэй».

Арыштаваныя і асуджаныя салдаты з менскай губэрскай турмы ў ліку 400 асоб, вітаючы «Зьвязду», і дасылаючы ў яе «жалезны фонд» 32 р. 96 кап., зьвярнуліся праз газэту з закліканм: «Салдаты, селяне і рабочыя, ідзеце за «Зьвяздой» таму, што яна паказвае правільны шлях і абараняе толькі вашы інтарэсы».

Апрача гэтых дзесяткаў калектыўных лістоў з прывітаньнем «Зьвязьдзе», рэдакцыя атрымлівала **шмат індывідуальных лістоў** ад асобных салдат. Эскадронны дэпутат 18-га гусарскага Нежынскага палка ў сваім лісьце піша, што ён... «меў шчасьце прачытаць нашу газэту. Глыбока ўзрушан і абураны тым, што раней нам не дасылалі такіх газэт, якія абараняюць інтарэсы няшчаснага салдата, што сядзіць у акопах».

Як-бы барометрам нарастаньня сымпатый да «Зьвязды», заваяваньня ёю шырокіх салдацкіх мас служыць «жалезны фонд», у які **за тры месяцы** літаральна па капейках было сабрана каля 8.000 руб. На гэтыя салдацкія і рабочыя капейкі і ўтрымлівалася «Зьвязда».

Шматлікія хадакі прыходзілі з ваенных часьцей спэцыяльна прынесьці сваю «скромную лепту» і атрымаць сьвежы нумар «Зьвязды».

Недарма афіцэрства і згодлікі адчувалі ў «Зьвязьдзе» свайго лютага ворага. У зводках **«Аб настроях войск і здарэньняў»** з розных армій, штабныя афіцэры паведамляюць, што «без газэты бальшавіцкага напрамку «Праўды», «Солдатскай праўды» і іншых падобных, салдаты адчуваюць сябе, як бы абязззброенымі, хаця на зьмену гэтым газэтам пачынаюць распаўсюджвацца значэ больш шкодныя газэты: «Зьвязда» і «Окопный набат», якія нападаюць на фронт кантрабандным шляхам, устанавіць які пакуль не зьявілася магчымым»... (зводкі 2-й арміі 9-га армейскага корпусу ад 12 жніўня 1918 г.).

«... У Туркестанскай стралковай дывізіі назіраецца [illegible] бражэньне [illegible] можна [illegible] са зьвя[illegible] палкох і ва ўстановах бальшавіцкай газэты «Зьвязда», якая пекім дасылаецца дармова ў вялікай колькасьці...»

Такіх паведамленьняў дзесяткі. Камандваньнем прымаюцца ўсе меры, каб не дапускаць «Зьвязду» ў акопы. У палявых паштовых канторах устанаўліваецца спэцыяльны кантроль за тым, каб не дайшоў да салдат ні адзін нумар «Зьвязды». Рэдакцыі прыходзіцца рознымі замаскаванымі спосабамі дасылаць «Зьвязду» на фронт: пакіроўваюцца спэцыяльныя асобы з «транспартам», укладваецца «Зьвязда» ў афіцыйныя газэты «Фронт» і г. д.

Контр-разьведны прапаноўецца выведаць адрас рэдакцыі, друкарні і прозьвішчы супрацоўнікаў «Зьвязды». У штабе Заходняга фронту вылучаецца спэцыяльная асоба для зьбіраньня матар'ялаў аб дзейнасьці «Зьвязды» і на падставе гэтага пішацца данос у цэнтр.

Ужо **9-га жніўня**—гэта значыць праз 13 дзён пасьля выхаду 1-га нумару «Зьвязды», генэрал Балуеў піша ваеннаму міністру сакрэтную тэлеграму наступнага зьместу:

«З 27-VII у Менску пачала выходзіць газэта «Зьвязда», якая прапаведуе ідэі бальшавізму. У выданых 4-х нумарох рэдакцыя асуджаецца палітыка ўраду і заклікаецца да недавер'я яму, выказваецца пратэст супроць распрадзіжэньняў, накіраваных да аднаўленьня баяздольнасьці арміі, начальствуючыя асобы трактуюцца як контр-рэвалюцыянэры, сеецца варожасьць паміж клясамі, патрабуецца перадача ўсёй улады ў рукі Саветаў.

У сувязі з вышэйуказаным хадайнічаю аб аддачы распарадзіжэньня аб закрыцьці газэты «Зьвязда».

На 17-м нумары «Зьвязда» ўрадам Керанскага закрываецца. Замест яе выходзіць газэта **«Молот»,** якая вядзе далей работу «Зьвязды» і становіцца яшчэ **больш масавай.** Тыраж «Молота» даходзіць да 8-10 тыс. экзэмпляраў.

З розных месц паступаюць у «Молат» салдацкія лісты з «пакорнай просьбай высылаць новапаступіўшую нашу пралетарскую газэту «Молот» (з ліста салдата інжынэрнага палка 1-ай сапёрнай роты Сямёна Чарнова).

«Молот» заваёўвае аўтарытэт і за межамі Заходняй вобласьці. Вось ліст з Клінцоў, Чарнігаўскай губэрні ад камітэту ваеннай арганізацыі РСДРП, у якім яны просяць дасылаць газэту «Молот». Такіх лістоў было шмат.

Сіла «Зьвязды» і «Молота» ў тым, што яны непрымірымы змагаюцца за лінію нашай партыі, бязьлітасна выкрываюць згодніцкі твар прыслужнікаў буржуазнага афіцэрства —меншавікоў і эсэраў, на прапазываюць «здрадзнікамі» і «прадажнікамі бацькаўшчыны», а былога цара Мікалая Раманава,—абурацца карэспандэнт, — ня судзяць і не караюць. Наадварот, яго хаваюць як каштоўнасьць» («Молот», № 10).

Многа пішуць у «Зьвязьдзе» аб жорсткасьцях так званых ударных палкоў і казакаў.

«Мы чытаем, — піша салдат М.,—дасыланыя нам з вёсак лісты, у якіх пішуць, як там уранкі з казакамі б'юць нашых аднак і дзяцей, калі яны дазволяць зьняважыць чым-небудзь памешчыкаў»... («Зьвязда», № 12).

Рад лістоў сьведчыць, што інтэрнацыяналісцкія настроі глыбока прасякаюць у салдацкую масу. «Паветра, вады і зямлі хопіць для ўсіх і без вайны; вайна нас не ўзбагачае, а руйнуе: багатыром кішэні набівае, а нас, беднату, з твару зямлі сьцірае» — піша салдат В.

З лістоў відаць, што ў армії арыштоўваюць усякага, хто імкнецца выкрываць **імпэрыялістычны характар вайны... Лісты гаворыць аб глыбокім незадавальненьні ўрадам Керанскага, якое расьце ў салдацкіх нізох.**

У «Зьвязьдзе» за 24 жніўня (№ 17) салдат-карэспандэнт піша, што «пакараньне сьмерцю ў арміі—часьцей ранейшага, што любую «фізіяномію», якая не спадабаецца, могуць зьняць з плеч «у імя выратаваньня рэвалюцыі». Гэты салдат робіць вывад, што «пры рэвалюцыі мы былі вельмі вялікадушнымі да сваіх ворагаў і зараз расплачваемся за гэта сваё вялікадушша. «Падпіхваньне» арміі і ўстанаўленьне дысцыпліны адбываецца чыста-дарэвалюцыйным шляхам».

Шмат горкіх пытаньняў ставіцца салдатамі: дзе-ж заваяваная свабода? Мы змагаліся супроць пакараньня сьмерцю, а яна пачала дастасоўвацца часьцей, чым пры самаўладзьдзі. Мы змагаліся за мір, а нас расстрэльваюць уласныя войскі і г. д.

Праз «Зьвязду» салдаты зварачаюцца да палкоў, якія праводзілі расфармаваньне, і да салдат, якія ахоўваюць арыштаваных, з наступнымі словамі: **«Вы падумайце, таварышы, калі нас перастраляюць, дык тады прыйдзе чарга і за вамі, і вас скруцяць у барані рог»** («Зьвязда», № 12).

У радзе лістоў карэспандэнты «Зьвязды» выкрываюць зладзействы афіцэрства і інтэндантскага чыноўніцтва, паказваюць іх контр-рэвалюцыйны твар.

«У Пермскім шпіталі, — паведамляецца ў «Молоте» № 10, — праводзіцца строгая «эканомія» прыпасаў, дзякуючы чаму хворыя галадаюць, а начальства тлусьцее. Начальнік шпіталю, як сьмерці баіцца бальшавікоў і пераконвае каманду не рабіць пропэнтных адлічэньняў на карысьць менскага савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў, таму што там сядзяць бальшавікі. Агульныя сходы каманды начальнік дазваляе вельмі неахвотна».

«У 38-м корпусе,—піша тав. Ч.,—арыштавана 11 салдат за тое, што яны далі пачытаць сваім таварышом дзьве бальшавіцкія брашуркі. Арыштаваныя ў ліпені, да гэтага часу сядзяць бяз допыту» («Молот», № 12).

Салдаты-карэспандэнты пішуць свае лісты таксама і вершамі. У **«Буревестнике»** № 4 зьмешчана цэлая падборка такіх салдацкіх лістоў. Большасьць іх прысьвечана нарастаючай роспачы салдат у чаканьні міру. **Тав. Бярэзін** у сваіх вершах піша: «Таварышы, за што паюем—мы ня ведаем. За што мы ў бойках паміраем? Каму, навошта патрэбна вайна?» І тут-жа сам адказвае: «Вайны хочуць толькі багацеі, купцы, захватчыкі зямлі; над імі-ж ня рвуцца гранаты і жыцьцём не ахвяруюць яны».

Тав. Ермакоў у сваіх вершах гіпэрбалізуе вайну. Гаворачы аб прарыве пад Рыгай, ён піша: «Нам загадваў Карнілаў, каб і кроку не адступаць, а камандніку складу казаў далей уцякаць».

Другі салдат **В. Ш. Катаў** піша свае ўражаньні ў часе паездкі ў вёску, дзе вайна «да поўнай перамогі» давяла жонак і дзяцей салдацкіх да поўнага зруйнаваньня».

Заходзіў я ў хаты бедны
Па родных вёсках:
Зморныя і бледныя
Туляцца і мёрзнуць па кутках
А вось кущцы солодка п'юць і ядуць
І да хрыпаты крычаць:
«Да пераможнага канца».

У нумары 6 **«Буревестника»** салдат **М. Пахомаў** друкуе сваю казку на тэму **«Адкуль пашлі на зямлі буржуі і папы і калі ім прыйдзе канец?»** У ёй ён піша: «Здагадаліся, нарэшце, мужыкі адкуль да іх цар і буржуй зьявіліся і зразумелі, што ўсе пяшчасьці іх ад цароў, папоў і буржуяў... **Тады мужыкі ў адзін прыгожы дзень зьнішчылі цара, папоў, войска буржуяў, капітал і ўсе клясы».**

Як многа сказана ў гэтых простых словах.

Такава салдацкая паэзія, такавы салдацкія думкі.

Гэтыя простыя салдацкія лісты, якія друкаваліся ў дакастрычніцкай «Зьвязьдзе», рабілі **вялікія справы.** Яны ўзброювалі салдат супроць афіцэрства, разлагалі рады імпэрыялістычнай арміі, **арганізоўвалі рэвалюцыйных салдат вакол бальшавіцкай арганізацыі, пад сьцягам Маркса-Леніна падрыхтоўвалі да пралетарскай рэвалюцыі.**

---

*) Лічбы ўсюды даюцца па старым стылі.

Менск, друкарня «Зьвязды»

Дзесятнік Цясьлёнак паказвае ўзоры барацьбы за добрую дарогу

Маладзны дзесятнік ліпейнага вучастку 73-76 клм. (у маршрутны вучастак) тав. **Цясьлёнак** Пракоп меў задачу: пабудаваць 4 клм. дарогі не пазьней 1 жніўня. Тав. Цясьлёнак гэту задачу з гонарам выканаў **7 ліпеня, г. зн. на 23 дні раней тэрміну.**

Зараз тав. Цясьлёнак, атрымаўшы прэмію за ўдарную работу, перакінут на больш адкрыты вучастак старшага дзесятніка **Майсеенка** для ліквідацыі адставання. Энтузіяст дарожнага будаўніцтва, малады дзесятнік абавязаўся і тут скончыць работу датэрмінова.

У чым-жа «сакрэт» перамогі дзесятніка Цясьлёнка, дзесятніка які ледзь-ледзь можа скласьці разьліковую ведамасьць і які зусім нядаўна ліквідаваў сваю няпісьменнасьць?

Яго посьпехі—вынік ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна. Тав. Цясьлёнак арганізавана набраў рабочую сілу. Ён не чакаў, пакуль пачнуцца работы, пакуль «пехта» дасьць рабочых. Ён зімой хадзіў па калгасах і вёсках, якія былі да яго прымацаваны, праводзіў сходы, тлумачыў задачы дарожнага будаўніцтва. І ў выніку—заключана 145 дагавораў з калгасамі, калгаснікамі, беднякамі і сераднякамі—аднаасобнікамі.

Тав. Цясьлёнак добра ўявіў, што гэту рабочую сілу трэба правільна арганізаваць і расставіць. Ён усіх людзей (240 чалавек) арганізаваў у брыгады па 5-6 чалавек. Кожнай брыгадзе было дана заданьне, растлумачаны нормы, указана, як трэба працаваць і дзе. Кожны рабочы і работніца ведалі, колькі за якую работу атрымаюць.

Тав. Цясьлёнак клапаціўся аб тым, каб лепш забясьпечыць бытавыя ўмовы рабочых. Ён для кожнай брыгады сам з членам сельсавету шукаў лепшую кватэру, ён ведаў дзе, хто і як жыве, хто і як працуе.

Тав. Цясьлёнак зварачаў увагу на самыя «дробязныя» моманты ў жыцьці і рабоце сваіх брыгад. Возьмем адзін прыклад: забесьпячэньне рабочых вадой у часе работы на лініі.

У т. Цясьлёнка правільна наладжан улік працы, свайчасова прымаецца работа, правільна робіцца не ацэнка па зьдзельнай выпрацоўцы. Няма ўраўнілаўкі: за больш цяжкія і кваліфікаваныя работы атрымліваюць больш. Нормы сыстэматычна перавыконваюцца.

Напрыклад, па капаньні паўкарытаў для правільнай дарогі, замест 6 пагонных метраў, рабочыя даюць 10 мэтраў; па плянаўцы замест 30 мэтраў—45 і г. д.

Лепшыя брыгады **Краска Васіля, Асташкевіч Дуні, Шаўкуна Веры** замацаваліся да канца будаўніцтва. Гэтыя брыгады прэміраваны, як лепшыя з лепшых. Яны, калі па трэбна было ішлі на штурм і працавалі ўночы.

Тав. Цясьлёнак выклікаў на сацспаборніцтва дзесятнікаў **Дукала, Галавана, Данілаву.** Спаборнічаюць брыгады і асобныя рабочыя паміж сабой. Няма цякучасьці рабочай сілы.

Аўтарытэт дзесятніка Цясьлёнка настолькі вялікі сярод рабочых, што яны згадзіліся перайсьці з ім на другі вучастак, далёка ад дому. Ад выходнага да выходнага дня мясцовыя рабочыя забіраюць з сабой прадукты і ідуць ці ездуць працаваць да свайго дзесятніка.

Ня многія дзесятнікі могуць пахваліцца такім аўтарытэтам сярод рабочых. А сродкі для заваяваньня такога аўтарытэту простыя: поўнае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна.

А. Мікуцкі.

Ні аднаго камсамольца бяз удзелу ў правядзеньні дэкадніка рэалізацыі пазыкі на вёсцы

Рэалізацыя пазыкі «чацьверты заваршальны» па БССР праходзіць незадавальняюча. У радзе раёнаў рэалізацыя сярод калгасьнікаў вялі сярэдна (Асьвейскі, Бешанковіцкі, Быхаўскі, Гарадоцкі, Хойніцкі, Прапойскі і інш.).

Ва многіх раёнах мелі месца скажэньні і перагібы. Масава-растлумачальная работа пад мяняўся голым адміністраваньнем (Брагін, Рэчыца, Быхаў, Магілеў), адсутнічала канкретная дапамога гораду вёсцы. Камсоды ня сталі на чале кампаніі.

Ленінскі камсамол Беларусі, які мае немалы зазлуг на фінансавым фронце, правяў ва лікую актыўнасьць у разгортваньні кампаніі ў горадзе. Улічваючы слабасьць рэалізацыі пазыкі на вёсцы, ён зараз па-баявому разгортвае работу, ў раёнах.

Пастановай бюро ЦК ЛКСМБ абвешчан камсамольскі дэкадник дапамогі вёсцы ў рэалізацыі пазыкі. Дэкадник ставіць матай дабіцца да моманту 7-га тыражу пазыкі «Траці рашэчны», які адбудзецца ў Гомелі, поўнага завяршэньня рэалізацыі пазыкі «чацьверты завяршальны». На аснове шырока-разгорнутай масавай работы акопіць падпіскай кожнага калгасьніка, і працоўнага аднаасобніка. Тольки спаравцыйнае, штодзеннае кіраўніцтва і дапамога з боку кіруючых камсамольскіх арганізацый нізавым ячэйкам, калектывам і асобным камсамольцам забясьпечыць посьпех дэкадніка.

Неабходна ўжыць усе выпрабаваныя формы і методы масавай работы, арганізаваць вы езду камсамольскім брыгадам і камсамольцам сацыялістычных пуцёвак па рэалізацыі пазыкі, практыкаваць посылку камсамольскіх букірных агітбрыгад для правядзеньня масавай работы непасрэдна на полі. Скарыстаць фізкультурныя і вольнасьпортыўныя пробегі для папулярызацыі тыражу і рэалізацыі пазыкі. Забясьпечыць раздачу агітматэрыялу, плякатаў і выпуск газэтаў-малюнкаў аб ходзе дэкадніка. Ужываць падворныя абходы з мэтай рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобні каў. Разгарнуць міжраённае і ўнутрыраённае сацспаборніцтва на лепшае скончэньне падпіскі. Праводзіць мастацкія вечары ў клюбах і хатах-чытальнях. Трэба правесьці камсамольскія сходы з удзелам беспартыйнай рабочай і калгаснай моладзі па пытаньні дэкадніка.

На калгасных базарах трэба арганізаваць сіламі ашчадкас кансультацыю для калгасьнікаў і працоўных сялян—аднаасобнікаў па пытаньнях пазыкі, наладзіць праверку і выплату выпаўшых на аблігацыі выйгрышаў.

На працягу дэкадніка неабходна арганізаваць камсамольскія юнкораўскія рэйды па праверцы работы ашчадкас, сельсветаў, па выдачы падпіскным апломаных аблігацый пазыкі «трэці рашэчны». Трэба максымальна актывізаваць камсамольскі друк, павысіць удзел рабкораў і сялькораў-камсамольцаў у асьвятленьні ходу падпіскі і яе афармленьні, увязаўшы гэту работу з абвешчаным газэтай «Рабселькор» конкурсам—спаборніцтвам друку на лепшае правядзеньне рэалізацыі пазыкі на вёсцы.

Бюро ЦК ЛКСМБ і Наркамфін БССР устанавілі пераходны сьцяг імя ЦК і Наркамфіну. Сьцяг атрымае тая камсамольская арганізацыя, якая дасягне 100 проц. акопу падпіскай, калгаснікаў, і аднаасобнікаў пабальшавіцку правядзе афарміленьне падпіскі.

Трэба выпучыць апорна-показальныя камсамольскія ячэйкі буйнейшых перадавых прадпрыемстваў, МТС, саўгасаў і калгасаў, якія-б занялі вядучую ролю.

Камсамольскія арганізацыі павінны ўстанавіць дасканалы ўлік правядзімых у часе дэкадніка мерапрыемстваў, ліквідуючы гэтым абязьлічку ў рабоце.

Камсамолу, выступіўшаму застрэльшчыкам у вясковым дапамогі вёсцы, павінна быць аказана максымальная дапамога з боку ўсёй савецкай грамадзкасьці. Ні аднаго камсамольца бяз удзелу ў правядзеньні дэкадніка!

ПЕРЭЛЬМАН.

Рэвалюцыйныя салдаты рэзка рэагавалі на факты рэпрэсій з боку ўраду Керанскага, якія падпадала «Зьвязда». Так, напрыклад, салдаты другой роты **12-га чыгуначнага батальёну** абураны тым, што «паважаная наш газэта «Молот» і друкарня яго чатана, у той час, калі контр-рэвалюцыянеры гулялі па волі, а контр-рэвалюцыйны друк вядзе сваю гнусную справу. **Мы рашуча пратэстуем,—пішуць салдаты,—супроць праследваньня сацыялістычнага друку і патрабуем неадкладнага зьняцьця арышту з друкарні, дзе друкуецца «Молот»** («Буревестник», № 11, ад 20-X-1917 г.).

Другія салдаты 1-й асобнай роты ў ліку 115 чал., пратэстуючы супроць закрыцьця газэты «Молот», **патрабуюць** у сваёй рэзалюцыі «гарантыі ад Часовага ўраду, што **ў далейшым выданьне газэты «Буревестник» ня будзе закрывацца,** патрабуюць, каб «у далейшым такіх контр-рэвалюцыйных загадаў ня было» («Буревестник», № 13).

Матар'ялы «Зьвязды» часта чыталіся калектыўна на сходах салдат. Тав. К. з **9-ай роты Сібірскага палка** піша наступнае: «Не магу апісаць, з якой зацікаўленасьцю і захапленьнем я чытаў яе і з якой уважлівасьцю слухала ўся паўрота. І сабраўшы лішнія капейкі, выпісалі на свой разьдзел гэту газэту. Няхай-жа «Молат» куе рэвалюцыйны дух сярод салдат і б'е па галовах ворагаў пралетарыяту».

Праграма «Зьвязды»—праграма партыі бальшавікоў. Абмяркоўваючы нумары «Зьвязды», адначасова і **вербаваліся новыя члены партыі, новыя прыхільнікі бальшавікоў.** Так, салдаты 3 і 4 роты **Мінгрэльскага** палка пішуць у сваім лісьце ,што яны «поўнасьцю далучаюцца да вашай («Зьвязды») праграмы», **«якую заўсёды гаговы абараняць ад нападу контр-рэвалюцыянераў і буржуазіі».**

На сваіх старонках «Зьвязда» сыстэматычна праў агляды друку і іншыя артыкулы **выкрывае контр-рэвалюцыйную ролю буржуазных газэт:** «Русское Слово», «Русские ведомости», «Единство» (Плеханава), «Гроза» (чорнасоценная), «Речь» (кадэцка-тарпілаўская і г. д.). А трэба памятаць, што ў той час, калі бальшавікам газэтам заход у акопы быў забаронены, буржуазнымі газэтамі—гэтай атрутай закідвалі салдат у вялікай колькасьці.

На старонках «Зьвязды» выкрываецца здрадніцкая роля меншавіцкай газэты «Фронт», дзе новялічкая група меншавікоў-абаронцаў — фальсыфікатараў выступае са сваімі «адозвамі» да «сацыял-дэмакратаў армії».

Ідучы ... і салдацкіх дэпутатаў. Перад зьездам у армії павінны быць праведзены армейскія зьезды камітэтаў. «Абаронцы» выступаюць супроць скліканьня гэтага зьезду, усіляк імкнуцца сарваць яго. **«Зьвязда» праз галасу згодніцкіх камітэтчыкаў зварочваецца непасрэдна да салдат фронту і тылу** з лістом, дзе растлумачвае клясавую сутнасьць паводзін «абаронца» і заклікае не паддавацца правакацыі, «склікаць зьезды: армейскія, карпусныя, дывізійныя, выбіраць ад 20-25 тысяч салдат па аднаму прадстаўніку на ўсерасійскі зьезд. **Армія павінна быць прадстаўлена на зьезьдзе»,**—так заканчвае «Зьвязда» свой заклік.

Вялікую практычную дапамогу ў справе распаўсюджаньня «Зьвязды», «Молота» і «Буревестника» аказваюць арыштаваныя ўрадам Керанскага салдаты, якія сядзелі ў менскіх турмах і гаўптвахтах. Тав. **Фамін** на вечары ўспаміна ў аб Кастрычніку на Беларусі расказвае, што «паражэнцаў, якія сядзелі ў турме па загаду Керанскага нам удавалася ў сувязі са слабым там рэжымам, выпускаць па адзіночку. Яны ў нас зьяўляліся разносчыкамі і распаўсюджвацелямі «Зьвязды». У нас была цэлая армія, якая пашырала нашу літаратуру».

У «Зьвязьдзе» за 24 жніўня паведамляецца, што **«за апошнія дні падпіска на «Зьвязду» ўзмацнілася** галоўным чынам з боку дзейнічаючай армії. Характэрна, — адзначае «Зьвязда,—што многія **салдаты падпісваюцца** на нашу газэту ня толькі для сябе, але і **для сваіх сем'яў,** у выніку чаго газэта пачынае высылацца нам ў вёскі самых розных губэрань Расіі».

Арыштаваныя салдаты былі таксама актыўнейшымі карэспандэнтамі і чытачамі «Зьвязды». **«Зьвязда» выхавала з іх надзейных барацьбітоў за пралетарскую рэвалюцыю.** З вялікай часткі гэтых салдат 26 кастрычніка быў сфармаваны **першы рэвалюцыйны полк імя Менскага савету.**

Да кастрычніцкіх дзён «уся армія,—як піша тав. **Кнорын,** — ужо была ахоплена бальшавізмам. Селянін-салдат ішоў у партыю для таго, каб завалваць зямлю, зьнішчыць памешчыкаў і пакончыць з вайной: ён быў поўны рэвалюцыйнага энтузіязму і гатоўнасьці прыкласьці свае сілы для таго, каб сьцерці з твару зямлі клясу памешчыкаў з усімі яе фэадальнымі рэшткамі, каб зьнішчыць уладу буржуазіі...»

Вялікая **заслуга** ў гэтым была і **«Зьвязды»,** і яе **актыўных карэспандэнтаў—салдат фронту і тылу,** сотні лістоў якіх надрукаваны на старонках «Зьвязды», «Молота» і «Буревестника» ... прадстаўнікоў

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Барацьба за тэмпы вырабу і якасьць прадметаў шырокага спажываньня —адна з асноўных задач кожнай вытворчай партарганізацыі

Важнейшая задача партыйнай работы

Арганізацыя уцільцэхаў і паогул вырабу тавараў шырокага спажываньня — адна з асноўных умоў пасьпяховага разгортваньня савецкага і калгаснага гандлю, палянішэньня рабочага снабжэньня. Апошні аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б абавязаў «мясцовыя партыйныя і фабрычныя арганізацыі паставіць **задачу разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, як адну з важнейшых задач гаспадарчай і партыйнай работы** на вытворчых прадпрыемствах».

Як-жа выконваюць гэту дырэктыву пленуму менскія вытворчыя партарганізацыі?

Тыя матар'ялы, што зьмяшчаюцца сёньня на старонках «Зьвязды» па гэтым пытаньні, сьведчаць аб тым, што за апошнія дні ёсьць ужо некаторы зрух наперад. Разгортваючы шырокую масавую работу, рад вытворчых партыйных арганізацый Менску забясьпечыў агульнай увагай справу арганізацыі вырабу тавараў шырокага спажываньня, дабіўся практычных рэзультатаў у гэтым напрамку.

Асаблівай увагі заслугоўвае вопыт фабрыкі **імя Крупскай,** дзе пачалі скарыстоўваць уцільдыходы на выраб надрэннай якасьці вяровак. Гэты вопыт зьяўляецца прыкладам таго, як трэба **гібка і канкрэтна** падыходзіць да ажыцьцяўленьня тэй ці іншай задачы, скарыстоўваючы вытворчы вопыт, ініцыятыву і вынаходніцкую мысль рабочых мас.

Аналёгічны вопыт мае месца таксама па менскай **абутковай** фабрыцы.

Аднак, гэта толькі першыя крокі. Дасягнутыя посьпехі некаторымі прадпрыемствамі ні ў якім разе не задавальняюць патраба ваньняў калгаснага рынку. Тэмпы разгортваньня работы па вырабу тавараў шырокага спажываньня, арганізацыі уцільцэхаў, выкарыстаньня каштоўных адыходаў вытворчасьці яшчэ далёка нездавальняючыя.

На паасобных прадпрыемствах ёсьць яшчэ пагардлівыя адносіны да «уцільсправы», фармальны падыход да выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб савецкім і калгасным гандлі. Да такіх прадпрыемстваў адносіцца, напрыклад, завод «Ударнік», дзе бюро партыйнага калектыву абмежавала свой удзел у разгортваньні вырабу прадметаў шырспажыву... вынясеньнем шматслоўных дэклярацыйных пастаноў. Яшчэ нічога не зрабіла для таго, каб правесьці ў жыцьцё свае-ж пастановы.

Кожная вытворчая партыйная арганізацыя павінна рашуча перамагаць шкодныя настроі недацэнкі такой важнай палітычнай справы, як выраб тавараў шырокага спажываньня, мабілізаваць на гэту справу ўвесь рабочы калектыў свайго прадпрыемства. Трэба з вялікай увагай адносіцца да рацыяналізатарскай і вынаходніцкай ініцыятывы рабочых, без малейшай цеганіны яе падхапляць і скарыстоўваць.

Толькі ў гэтым выпадку можна дабіцца патрэбнага пералому ў справе максымальнага выкарыстаньня ўнутраных рэсурсаў нашых прамысловых прадпрыемстваў на стварэньне вялікага патоку на калгасны рынак тавараў шырспажыву. Разам з гэтым нельга выпускаць з-пад увагі барацьбу за **якасьць** прадукцыі уцільцэхаў, з чым у нас яшчэ справа стаіць ня зусім добра.

Калгас, калгаснік і працоўны аднаасобнік павінны атрымаць багаты асартымэнт тавараў і высокаякасных прадметаў, патрэбных у іх гаспадарцы. За выкананьне гэтай задачы павінны адчуваць адказнасьць кожны камуніст.

Плян вырабу прадметаў шырспажыву перавыконваецца

На Менскай абутковай фабрыцы, дзе свайчасова сярод рабочых прапрацавана пастанова ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, фабрычна-заводзкія арганізацыі па-баявому узяліся за рэалізацыю пастаноў пленуму, у прыватнасьці, па вырабе прадметаў шырокага спажываньня.

Бюро парткалектыву, распрацаваўшы гэта пытаньне, стварыла штаб, якому даручыла кіраваць і арганізоўваць выпуск прадметаў шырспажыву. Гэты штаб правёў вялікую работу як па растлумачэньні сярод рабочых значэньня сустрочнага патоку тавараў шырспажыву ў сыстэме савецкага гандлю, так і ў практычным наладжаньні выпуску гэтых прадметаў.

Фабрыцы дано заданьне на трэці квартал з адкідаў і забракаваных скур выпусьціць 3.000 пар бацінак 35-га і 36-га нумароў. За ліпень месяц, у які толькі наладжвалася вытворчасьць, паводле пляну памячалася выпусьціць 450 пар. Гэты плян перавыкан. На 30 ліпеня выпушчана 500 пар пускаюцца гэтыя баціны з абрэзкаў склеенай усьцілцы і гумавых падэш

Партыйны калектыў арганізаваў рабочых прапаноў. Нядаўна паступілі тр пановы аб скарыстаньні самых дробных абрэзкаў скуры і тканіны. Прапанова т. Лун яна аб вырабе з дробных абрэзкаў паўбаці нак № 27 і 28 заключецца ў тым, каб да салозак рабіліся халяўкі з тонкіх паскёў Прапанова прынята і ўжо наладжваецца выпуск гэтых паўбацінак.

Першая партыя выпушчаных прадметаў шырспажыву (бацінак), 80 проц. якой былі адасланы Белжанпасаюзу, а 20 проц. — ЗРК ужо рэалізавана. Спажыўцы задаволены та варам.

Р.

Рэзультаты добрай растлумачальнай работы

Партыйны калектыў машынабудаўнічага заводу **імя Варашылава** яшчэ ў першых лічбах чэрвеня абмеркаваў пытаньне аб вырабу тавараў шырокага спажываньня. Апрача таго, гэта пытаньне было шырока абгаворана на пленуме фабрычна-заводзкага камітэту. Адначасова з гэтым на заводзе была праведзена растлумачальная работа ў цэхах і брыгадах.

У жо з 15 чэрвеня пры заводзе працуе уцільцэх, які з адыходаў машынабудаўнічай вытворчасьці выробляе значную колькасьць рэчаў, патрэбных для калгаснай гаспадаркі і працоўных аднаасобнікаў. Цэх выробляе прабої, шыны, лемяхі, шворны, падковы, скавароды, зубы для бораў і г. д.

З 15 чэрвеня па 1 ліпеня гэтым цэхам выпушчана рэчаў шырокага спажываньня на 10.000 руб. А за першыя дзьве дэкады ліпеня цэхам выраблена гэтых тавараў ужо на 20.000 р., вытворчае заданьне выкана на на 175 проц.

Такая ўдарная работа уцільцэху тлумачыцца перш за ўсё тым, што партыйная арганізацыя заводу разгарнула масавую работу сярод рабочых, растлумачыла ім, якое вялікае значэньне мае арганізацыя вырабу тавараў шырокага спажываньня.

Некаторыя дасягненьні ёсьць і ў справе прасоўваньня прадукцыі уцільцэху на калгасны рынак. Бельсельгасснаб і Менскі ЦУС свайчасова рэалізавалі першыя партыі тавараў шырокага спажываньня, выробленых заводам імя Варашылава.

Зараз перад партыйнай арганізацыяй заводу стаіць задача — разгарнуць работу па забесьпячэньні цэху рабочай сілай, якой на заводзе адчуваецца вялікі недахват.

М.

ЛІКВІДАЦЫЯ АБЯЗЬЛІЧКІ РАМОНТУ і ДОГЛЯДУ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ УЗДЫМ ВАГОНАЙ ГАСПАДАРКІ

Вынікі дрэнна арганізаванага рамонту

Вагонная гаспадарка—рашаючае зьвяно чыгуначнага транспарту—знаходзіцца ў нездавальняючым стане. Гомельскае дэпо-сартовачная да 20 ліпеня недадала чыгунцы 352 вагоны. За чэрвень адчыслена абменным пунктам для здачы ў рамонт 1.040 вагонаў. Агульны процант хворых вагонаў на вузьле на працягу некалькіх месяцаў хістаецца паміж 2-3 проц. супроць заданьня 0,8 проц.

Гомельскі рамонтны пункт адпраўляе вялікую колькасьць вагонаў неадрамантаванымі. За 8 ліпеня пунктам адпраўлена ў Жлобін 170 хворых вагонаў па першай катэгорыі і 190 — па другой. Якасьць праведзенага рамонту таксама надзвычай нізкая. Вагон № 591.669 прайшоў капэвэцыйны рамонт, а праз некалькі дзён быў здан у паўторны. У вагоне № 591.668 была зроблена дрыўлянная абшыўка з сырога матар'ялу, калі яна высахла, дык патрэскалася. Дрэўцах заводу імя Ланцуцкага дрэнна апрацоўвае абшыўку, а адміністрацыя на гэта не зварачае ніякай увагі.

Бягучы рамонт затрымліваецца з прычыны несвайчасовай падачы вагонаў на рамонтныя пуці, а таксама няправільнай расстаноўкі рабочай сілы. Часта замест чатырох агляднікаў вагонаў і чатырох сьлесароў працуюць толькі два агляднікі і два сьлесары. Дапаможных чорнарабочых зусім ня ставяць і таму чорную работу прыходзіцца выконваць кваліфікаваным рабочым.

Затрымліваецца рамонт яшчэ і таму, што тэхагенты надвайна адносяцца да працы. Спасылаюцца на адсутнасьць запасных частак у той час, калі побач, у дэпо, яны ёсьць у патрэбнай колькасьці (чэкаў — 1500 штук, крукоў 20 штук і г. д.).

Значным тормазам у разгортваньні работы па рамонце зьяўляецца непрыстасаванасьць памяшканьняў пад рамонтныя майстэрні і адсутнасьць мэханізацыі рэчу працэсаў.

Рабочыя ўжо некалькі разоў уносілі прапановы пачаць выпрацоўку ў дэпо пажатых запасных частак. Магчымасьці для гэтага ёсьць. Чыгуначныя арганізацыі абавязаны прыняць усе меры, каб прапановы рабочых неадкладна былі рэалізаваны.

Поўная рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна, рашучая ліквідацыя абязьлічкі як у рамонце, так і ў догляднзе забясьпечыць круты ўздым вагоннай гаспадаркі.

Н. Гасман.

Конкурс без кіраўніцтва

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Конкурс на лепшае правядзеньне аздаравіцельнай кампаніі вагоннага парку ў Віцебску праходзіць без належнага кіраўніцтва. Раённае журы бязьдзейнічае. З моманту абвяшчэньня конкурсу і да 23 ліпеня было толькі адно пасяджэньне і на гэтым работа спынілася. Дэпоўскае журы, гледячы на раённае, таксама нічога ня робіць. Яно сабралася толькі 10 ліпеня, вылучыла брыгады для ўдзелу ў конкурсе і на гэтым супакоілася.

Замест разгортваньня масавай работы, за мест бальшавіцкай мабілізацыі мас, журы абмежаваліся тым, што зваліл ўсю работу на вучотчыка, які, між іншым, яшчэ да гэтага часу ня мае інструкцыі як весьці ўлік па бальнай сыстэме, бо раён ... яе не адрукаваў.

Інструктар па масавай рабоце пры рабне тав. **Чэрапаў** займаецца толькі тым, што зьбірае весткі аб вылучаных брыгадах. У клюбе, па пэхах ніякай работы не вядзецца. Нават ня вывешаны лёзунгі.

Адсутнасьць масавай работы і дрэннае кіраўніцтва прыводзіць да таго, што плян сутачнага заданьня на вагонным цэху сыстэматычна ня выконваецца. Замест заданых 105 вагонаў у дзень, рамантуецца ў сярэднім толькі 60-70.

Якасьць рамонту нездавальняючая. За 3 дні выпушчана з нядобраякасным рамонтам 10 вагонаў. За чэрвень, паводле недакладнага падліку, адчоплена з прычыны дрэннай якасьці рамонту 28 вагонаў. Ёсьць рад выпадкаў, калі забракаваны пастамі агляду вагон, які накіроўваецца назад у вагонную майстэрню, варочаецца адтуль зноў з нявыкананым рамонтам. Слабы кантроль за якасьцю рамонту. У гэтай справе існуе **поўная абязьлічка.**

Ангорскі.

Астачы неадрамантаваных вагонаў не зьмяншаюцца

ЖЛОБІН (БЕЛТА). Неаднаразовыя сыгналы друку аб адставаньні вагоннага цэху дэпо Жлобін да гэтага часу ня прымусілі гаспадарнікаў перабудаваць сваю работу з тым, каб узьняць тэмпы выкананьня праграмы рамонту вагонаў.

Па-ранейшаму прастойваюць на калеях у чаканьні рамонту сотні хворых вагонаў. Давоўі прывесьці некалькі лічбаў астач за кожны дзень. Так, 20 ліпеня заставалася хворых неадрамантаваных вагонаў 107, 21-га—108, 22-га—73, 23-га—116 і 24-га —192.

Гаспадарнікі дэпо і вагоннага цэху не зварачаюць увагі на такое становішча. Замест сапраўднай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, замест правільнай арганізацыі працы і расстаноўкі сіл, гаспадарнікі спасылаюцца на недахват матар'ялаў, рабочай сілы і на гэтым супакойваюцца. Трэба заўважыць, што вучні школы ФЗВ не скарыстоўваюцца на рамонтнай рабоце, а накінуты ў канцылярыі.

На прамежныя станцыі паздвычай неакуратна высылаюцца сьлёсары для рамонту вагонаў, што адчапляюцца. У выніку на тутых станцыях ёсьць прастої вагонаў па 5 дзён і больш.

Струкаў зрывае работу

Дарожнае будаўніцтва па 5 вучастку праходзіць чарапашымі тэмпамі. Плян па дарбудаўніцтве далёка ня выканан. Абвешчаны месячнік штурму фактычна правален.

Галоўнай перашкодай да сапраўды ўдарнай работы зьяўляецца агітпрэдсьтычнае кіраўніцтва, якое ўзначальваецца начальнікам вучастку **Струкавым.**

Вось далёка ніпоўны пералік «мерапрыемстваў» Струкава, якія тармозяць работу вучастку.

Струкаў загадаў выплачваць рабочым зарплату па старых расцэнках. Ён груба парушыў пастанову СНК і ЦВК аб уключаньні прэміяльнай зьдзельшчыны. Ён-жа а[illegible] ім давалася, як спецпапратка.

Аплата работнікаў праводзіцца «па ўтле джаньні» Струкава. Яго асабісты сакратар атрымлівае ў месяц 450 руб., у гэты-ж час тэхнік, які мае спецыяльную падрыхтоўку і вялікі стаж у рабоце, атрымлівае 200 руб.

Партыйная арганізацыя вучастку паставіла пытаньне аб немагчымасьці далейшага знаходжаньня Струкава ў якасьці начальніка дарожнага вучастку. Але парторг вучастку **Сапога,** які знаходзіцца ў блізкіх зносінах са Струкавым, змазаў гэта пытаньне. Струкаў па-ранейшаму самадурствуе, што самым балючым чынам адбіваецца на

Новаму саўгасу даць сапраўдную дапамогу

У **Смалявіцкім** раёне на тэрыторыі **Варатоўскага сельсавету** арганізоўваецца новы саўгас на плошчы ў **2,5** тысячы гэктараў. Саўгас мае насеньпаводчы ўхіл.

Была дана дырэктыва аб тым, каб суседнія саўгасы перадалі ў распарадканьне новага саўгасу **10** трактараў маркі **«Фардзон».** Ня ўсе саўгасы выканалі гэту дырэктыву. Некаторыя саўгасы прыслалі трактары зусім нясправныя і патрабуючыя капітальнага рамонту.

Узор недобрасумленных адносін да новага саўгасу, паказвае дырэктар саўгасу **«Шыпяны»—Самадаеў.** Ён прыслаў у распарадканьне новага саўгасу 5 трактарыстаў, у ліку якіх быў лепшы работнік — **Зайцаў.** Пасьля таго, як Зайцаў прыступ да работы, **Самадаеў** адклікае яго назад саўгас, тлумачачы гэта тым, што ім патрэбны добрыя работнікі.

З гэтага прыкладу ясна відаць, **Самадаеў** новаму саўгасу не дапамагае, а збывае толькі горшых работнікаў.

Саўгас «Шыпяны» павінен забясьпечваць новы саўгас розным прадуктамі асабліва гародніцай. **Самадаеў** катэгарычна адмаўляецца выканаць гэта распарадканьне.

Раённыя арганізацыі не аказваюць належнай увагі саўгасу, які ня можа выйсьці з паласы прарыву.

Іосіфаў.

Помста за крытыку

(Ліст доктара)

У 1923 годзе я скончыў Маскоўскі дзяржаўны універсытэт і з таго часу працаваў у радзе раёнаў БССР на медычнай рабоце. З 1928 году і да гэтага часу я працаваў у гор. Барысаве, а таксама даваў лекцыі ў стара-барысаўскім тэхнікуме. Акрамя таго, бясплатна абслугоўваў рабочых саўгасу «Стары-Барысаў».

Выкананьне сваіх непасрэдных абавязкаў я заўсёды сумяшчаў з грамадзкай работай. У даным выпадку асабліва значэньне мае тое, што я выступаў на сходах і на адным з іх арганізаваў «радыё-газэту». Як у маіх выступленьнях, так і ў гэтай газэце мела месца крытыка недахопаў у рабоце райдзяленьня нашага саюзу і раённага інспэктара аховы здароўя **Нэйнбурга.**

Апошняму гэта не спадабалася. І вось ужо з сакавіка 1931 г. Нэйнбург пачынае да мяне чапляцца, выжываць мяне з раёну. У чэрвені 1931 году бяз усякіх прычын ён захацеў зьняць мяне з работы ў Стара-Барысаве. Калі гэта яму не ўдалося, ён прапанаваў мне абслугоўваць чацьвёрты раён, які да гэтага часу абслугоўваўся ўсімі дактарамі гораду па чарзе, з тэй прычыны, што ў чацьвёртым раёне надзвычай цяжкія ўмовы працы. У красавіку бягучага году Нэйнбург прымусіў мяне перайсьці на другую работу, дзе я затрачваю часу ў паўтары разы больш, чым раней, а зарплаты атрымліваю на 50 руб. менш.

Зьдзекаў нада мной з боку Нэйнбурга было нямала. Нарэшце, у канцы ліпеня я прымушан быў падаць заяву аб усім гэтым у райдзяленьне нашага саюзу. Але там пры актыўным удзеле Нэйнбурга ўзьнятыя мною пытаньні былі змазаны. Больш таго, Нэйнбург захоплены жаданьнем адпомсьціць мне за крытыку яго работы нашоў на тое, што падгаварыў адну з тахнічных работніц Турко распаўсюдзіць чуткі аб тым, нібы я прасіў яе... падпаліць больніцу. Пасьля гэтага мяне пачалі абвінавачваць у шкодніцтве.

Мне не заставалася нічога больш рабіць, як перадаць справу ў народны суд. Пасьля разгляду гэтай справы суд знайшоў, што абвінавачваньне мяне ў нясумленных адносінах да справы і тым больш у шкодніцтве несапраўдна, а Турко за ілжывае абвінавачваньне прысуджана да аднаго месяца прымусовых работ.

Ня гледзячы на тое, што рашэньне суда катэгарычна абвергнула прад'яўленыя мне абвінавачваньні, ніхто ў раёне ня прыняў ніякіх мер, каб палепшыць мае становішча.

У гэтым сваім лісьце я зварочваюся да рэдакцыі з просьбай дапамагчы мне стварыць належныя ўмовы для працы, такія ўмовы, якія маюць усе нашы дактары ў Савецкай дзяржаве.

МАМОЙКА.

АД РЭДАКЦЫІ. «Зьвязда» чакае ад **БАРЫСАЎСКАЙ КК-РСІ** неадкладнага расьледваньня справы тав. Мамойка і прыняцьця належных мер па пытаньні, закранутым у яго лісьце.

Прыцягнуць да адказнасьці хулігана

8 ліпеня г. г. сандоктар **Грыгарэвіч** агледзеў краму **№ 1 ЗРК друкарні імя Сталіна.** Ён знайшоў там грубае парушэньне пастаноў Менгарсавету аб утрыманьні крам у санітарным становішчы. На паліцах і прылаўку тоўсты пласт пылу. У засоках дзе знаходзяцца крупы, поўна павуцьцяньня. У складзе лужы вады і поўны беспарадак.

Для зьнішчэньня антысанітарнага стану вінча крамы быў дан тэрмін у 2 дні.

Калі **Грыгарэвіч** 10 ліпеня зьявіўся ў гэту краму для праверкі выкананьня яго прапаноў, ён убачыў, што адміністрацыяй нічога на зроблена для зьнішчэньня антысанітарыі.

На заўвагу **Грыгарэвіча** аб недапушчальнасьці невыкананьня яго прапаноў, нам. загадчыка крамы **Брэслаў** з лаянкай накінуўся на Грыгарэвіча і кулакамі выштурхнуў яго з крамы.

Значэньне санпагляду ўсім вядома. Калі гэтага ня хоча разумець **ЗРК друкарні імя Сталіна,** дык менская **РАЙКК-РСІ** павінна прыгусіць яго зрабіць гэта. Хуліган Брэслаў павінен быць пакараны.

Бірштэйн.

Зусім нядобра т. Наркевіч

(Ліст чырвонаармейца)

Нядаўна па калгасах **Плешчаніцкага** раёну праводзілася праверка становішча рахункаводзтва. Праверку гэту рабіў інструктар Белкалгасцэнтру **Наркевіч.**

Наркевіч, дзе толькі ня быў, даваў сваё заключэньне, што ў гэтым калгасе рахункаводзтва пастаўлена добра. **Але давайце паглядзім, што азначае гэта «добра».**

Возьмем калгас «Ільліч». Там перарасход грошай па касавай кнізе пастае 50 р. пастаўлен зусім дрэнна. Аднак, гэта не перашкодзіла **Наркевічу** даць заключэньне, што ў калгасе «Ільліч» рахункаводзтва пастаўлена «добра».

Цікава ведаць, чаму **Белкалгасцэнтр** пасылае для праверкі становішча рахункаводзтва ў калгасах такіх як Наркевіч, які сам нічога не разумее ў гэтай справе. **Белкалгасцэнтру трэба больш уважлива адносіцца** да пасылкі людзей у калгасы, бо такія, як [illegible]

А. ПРАТАПОВІЧ.

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА КАМПАРТЫІ ГЕРМАНІІ

Папярэднія вынікі выбараў у рэйхстаг

БЭРЛІН, 1 жніўня. (ТАСС). З гадзіны 35 м. па сярэдня-эўрапейскаму часу).

Паводле папярэдніх даных усяго падана галасоў 36.976.000, на 1.752.000 больш чым па выбарах у рэйхстаг 1930 г. (па выбарах у рэйхстаг у 1930 г. было падана 35.224 тыс. галасоў, на першым туры прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку 1932 г. 37.653 тыс., на другім туры прэзыдэнцкіх выбараў у красавіку 1932 г.—36.489 тыс.).

Галасы і мандаты разьмяркоўваюцца нашым чынам (у дужках лічба—выбары рэйхстаг 1930 г.).

Па даных аб галасох у тысячах:

Нацыяналісты 5.277 (4.590), 14,4 проц. усіх паданых галасоў.

Сацыял-дэмакраты 7.950 (8.575)—не выступалі самастойна,—**21,5 проц.** (24,5 проц.).

Цэнтр—4.600 (4.127)—**12,5** (11,8).

Баварская народная партыя 1.180 (1.059).

Нацыяналісты—2.174 (2.458) — **5,5 проц.**

Нацыянал-сацыялісты—13.732 (6.406) —**37,2 проц.** (18,33 проц.).

Народная партыя—436 (1.577).

Гаспадарчая партыя—146 (1.362).

Дзяржаўная партыя—375 (былыя дэмакраты)—1.332.

Хрысціянска - сацыялістычная — 362 (868).

Іншыя—700 (1.302).

Разьмеркаваньне мандатаў ў рэйхстагу

БЭРЛІН, 1/VIII. (ТАСС). Агенцтва Вольфа паведамляе: Паводле ня ўсіх даных, колькасьць мандатаў у рэйхстаг—**602.** Сацыял-дэмакраты атрымалі **133** (супроць 136 у папярэднім рэйхстагу), цэнтр—**76** (69), баварская народная партыя—**20** (19), **камуністы—89 (78), нацыянал-сацыялісты—229** (110), **Ландбунд—2, сялянская партыя—2** (5), **хрысціянска-сацыялістычная—2** (21), **нацыяналісты**—37 (42), **народная партыя — 7** (27), **ландфольк—1** (18).

Выбары ў Бэрліне

БЭРЛІН, 31 VII (ТАСС). Канчатковыя вынікі выбараў у Бэрліне: падана галасоў **1.141.023** (супроць 1.197.541 на выбарах у Ляндтаг 24 красавіка 1932 г.). Камуністы атрымалі **382.317 (352.444), сацыял-дэмакраты—318.950** (362.947), **нацыянал-сацыялісты—280.295** (288.316), **нацыяналісты—75.532** (81.974), **цэнтр—54.587** (46 65).

Выбары ў Цюрынгіі

БЭРЛІН, 1 VIII, (ТАСС). Учора здбываліся выбары ў цюрынгскі ляндтаг. Паводле папярэдніх даных, выбран 61 дэпутат, супроць 53 у мінулым ляндтагу (выбары 8 сьнежня 1929 г.), з 61 мандату **камуністы атрымалі 10 супроць 6.** Сацыял-дэмакраты—15 супроць 18. Нацыянал-сацыялісты 26 супроць 6. Нацыяналісты 2, супроць 2. Рэшта мандатаў разьмяркоўваецца паміж іншымі партыямі.

Галасы разьмяркоўваюцца: **камуністы 150.000,** сацыял-дэмакраты 225,6 тыс., нацыянал-сацыялісты 395,8 тыс., нацыяналісты—29,6 тыс

Заява старшыні прускага ляндтагу

БЭРЛІН, 31/VII. (ТАСС). Выступаючы па нацыянал-сацыялістычным прадвыбарчым сходзе ў Эсене, старшыня прускага ляндтагу нацыянал-сацыяліст **Карль** заявіў, што зараз партыя нацыянал-сацыялістаў ня толькі мае права, але нават абавязана ўзяць у свае рукі ўладу ў краіне і што «ад гэтых абавязкаў яна не адмовіцца, нават калі не даатрымае некалькі соцень тысяч галасоў. «Нацыянал-сацыялісты,—сказаў Карль,—не дазволяць пустыі цэнтра выхоўваць яе ў парляманцкім духу. Як Мусаліні разграміў каталіцкую народную партыю ў Італіі (папуляры), так нацыяналісты разгромяць партыю цэнтру».

Урад не атрымаў абсалютнай большасьці

БЭРЛІН, 1/VIII. (ТАСС). Ня гледзячы на выключны тэрор нацыянал-сацыялістаў і на дэмагогію, якую актыўна разьвівалі сацыял-дэмакраты, **камуністам удалося атрымаць вялікую перамогу** і павялічыць свае галасы супроць 1930 г. **на 558 тыс., супроць другога туру прэзыдэнцкіх выбараў на 1.672 тысячы за кошт сацыял-дэмакратаў.** У процантных адносінах камуністы па вялічылі свае галасы **на 14,4 проц. супроць 13,1 проц. у мінулым рэйхстагу.** Сацыял-дэмакраты, ня гледзячы на актыўнасьць, якую яны праявілі ў часе выбарчай кампаніі, ня гледзячы на мнімую апазыцыю, якой яны імкнуліся прыкрыць вае сапраўдныя адносіны да існуючага ўраду і фашызму, страцілі 724 тыс. галасоў у параўнаньні з выбарамі 1930 г. і ў радзе рэнаў значна страцілі параўнальна з прускімі выбарамі 1932 г.

Нацыянал-сацыялісты страціўшы ў рабочых раёнах Дюсельдорфу, Оппелен, Кёльн, Вестфалія, гор. Эсен і г. д., выйгралі ў іншых раёнах, за кошт сярэдніх буржуазных партый, галоўным чынам, за кошт народнай, гаспадарчай і дзяржаўнай партый. У параўнаньні з прускімі выбарамі нацыянал-сацыялісты ў процантных адносінах страцілі з 44 проц. да 37,2 проц. на ўчарайшых выбарах. Партыі цэнтру ўдалося набыць каля паўмільёна галасоў ,застаючыся ў паасобных мясцох Заходняй і Паўднёвай Германіі мацнейшай партыяй. Значныя страты панесьлі: дзяржаўная народная і гаспадарчая партыі. Гаспадарчая партыя атрымала два мандаты замест 23 у папярэднім рэйхстагу. Ландфольк—2 мандаты замест 19. Вынікі ўчарайшых перавыбараў не даюць магчымасьці скласьці ўраду абсалютную большасьць. Так званы Гарцбургскі фронт атрымаў у новым рэйхстагу каля 45 проц. Такім чынам, урад зможа атрымаць большасьць толькі ў тым выпадку, калі ўдасца нацыянал-сацыялістам згаварыцца з партыяй цэнтру.

Беспрацоўе сярод германскай інтэлігенцыі

БЭРЛІН. У ліпеньскай кніжцы ліберальнага журнала «Дзі тат» падаюцца цікавыя даныя аб беспрацоўі сярод асоб з вышэйшай асьветай. Журнал падкрэсьлівае адсутнасьць спэцыяльных статыстычных даных аб беспрацоўі сярод інтэлігенцыі і грунтуецца ў сваіх падліках на меркавальных лічбах, якія выходзяць з прыватных крыніц. Па думцы журнала, **колькасьць беспрацоўных асоб з вышэйшай асьветай хістаецца ад 30 да 70 тыс.** Да гэтага трэба дадаць значную колькасьць скончыўшых унівэрсытэты і займаючых пасады, якія як па характары работы, так і па аплаце вельмі не адпавядаюць таму становішчу, у якое звычайна ставяцца асобы з вышэйшай асьветай. Апрача гэтага, трэба ўлічыць і прадстаўнікоў так званых свабодных прафэсій (адвакаты, кансультанты, эканамісты, інжынэры, дактары, пісьменьнікі, мастакі і інш.).

Беспрацоўе асоб, што належаць да гэтай катэгорыі, заключаецца не ў сядзеньні «бяз месца», але ў надзвычай нізкім заробку або ў адсутнасьці апошняга. Калі ў 1927 г. (год **высокай** кан'юнктуры) 13,3 проц. германскіх адвакатаў мелі гадавы даход ня звыш 3 тыс. марак і трэцяя частка—ня вышэй 5 тыс. марак, дык можна сабе ўявіць, да якіх межаў зьнізіўся гэты даход у бягучы крызісны год.

Такія пэрспэктывы чакаюць 42 тыс. маладых людзей, якія скончылі сярэднюю школу. Калі ні адзін з іх ня будзе вучыцца далей, то і тады,—мэлянхалічна адзначае «Дзі дат»,—гэта адаб'ецца на рынку разумовае працы толькі праз 4-5 год так, што нават у гэтым непраўдападобным выпадку ў 1934 г. або 1935 г. амаль **трэцяя частка асоб з вышэйшай асьветай** ня здолее знайсьці дастасаваньне сваіх ведаў і працы ў Нямеччыне.

Амэрыканская пазыка Кітаю

ТОКІО, 1. У японскіх эканамічных колах аддаюць шмат увагі перагаворам амэрыканскай кампаніі: «Долар лейн» з кітайскай «Чайна Марчант Сьцім Навігейшэн Компані» аб прадастаўленьні пазыкі ў 30 млн. даляраў. Паводле вестак, перагаворы вядуцца далей у сакрэтным парадку, ня гледзячы на абвяржэньні абодвух бакоў. «Долар Лейн» настойвае на поўнай рэалізацыі суднаходзтва па Яцзы шляхам пазбаўленьня чужаземных параходаў правоў навігацыі і перадачы гэтых правоў выключна кітайскім кампаніям з тым, каб далейшая перавозка грузаў па морскіх лініях рабілася параходамі «Долар Лейн», якія павінна атрымаць пераважныя правы таксама і ў галіне імпартнага гандлю.

Японскія параходныя кампаніі загадзя заяўляюць, што спроба перадачы навігацыйных правоў па рацэ Яцзы выключна кітайскім параходствам сустрэне супраціўленьне з боку брытанскага і японскага ўрадаў, якія цяпер карыстаюцца навігацыйнымі правамі па рацэ Яцзы. Сьцьвярджаюць, што паміж ПАЗШ і нанкінскім урадам пачаліся перагаворы аб сярэбранай пазыцы ПАЗШ Нанкіну, а таксама аб продажы другой партыі серабра (першая партыя была прадана ў 1932 г.).

Антыяпонскі рух узмацняецца

ШАНХАЙ, 1. Антыяпонскія арганізацыі ў Шанхаі вядуць далей прапаганду за байкот японскіх тавараў і ў некаторых выпадках ужываюць пагрозы ў адносінах да купцоў, якія гандлююць японскімі таварамі. Некаторыя кітайскія фірмы атрымалі лісты, падпісаныя «шанхайскай групай крыві», дзе пагражаецца сьмерцю тым, хто будзе гандляваць японскімі таварамі. Некаторыя з гэтых лістоў былі ўкладзены ў рэвальвэрныя кулі.

Апошнія падзеі ў Жэхе ўзмацнілі антыяпонскія настроі, ня гледзячы на тое, што ўрад забараніе адкрытую дзейнасьць антыяпонскіх арганізацый. З прычыны распаўсюджаных чутак аб памеры японцаў у адказ на ўзмацненьне антыяпонскага байкоту акупаваць Чапэй, шмат жыхароў выехалі з Чапэю. Японскія рэзыдэнты ў Шанхаі праяўляюць вялікую зацікаўленасьць да ўсіх фактаў і японскія тэлеграфныя агенцтвы публікуюць штодзенна перапавялічаныя паведамленьні аб росьце антыяпонскага руху.

Мытная блёкада Манчжурыі Нанкінам

ШАНХАЙ, 1. З прычыны кратэсту супроць захвату мытных паступленьняў Манчжурыяй, нанкінскі ўрад парашыў ад сёньняшняга дня ўвесьці новыя мыты на лякарства, віно, тытун, штучны шоўк і інш. тавары, прычым мыты ў паасобных выпадках дасягаюць 80% кошту. Апрача таго, урад пакідае ў моцы ўведзеную ў мінулым годзе для дапамогі раёнам, пацярпеўшым ад паводкі 10% мыту. Мяркуюць, што абедзьве гэтыя меры ў выніку дадуць штогодны даход у разьмеры 20 млн. таэлей (таэль ровен 34 амэрыканскіх цэнтам). Урад параіў з сёньняшняга дня пачаць мытную блёкаду Манчжурыі.

У БАРАЦЬБЕЕ ЗА ВАРАШЫЛАЎСКІ СТРЭЛ

5-я ўдарная, імя чэка - славацкага пралетарыяту, дывізія — напярэдадні агнявой праверкі. У пачатку жніўня ва ўсіх часьцях дывізіі адбудзецца інспэктарская стральба з вінтовак, ручных і станкавых кулямётаў, артылерыі. На барацьбу за лепшыя рэзультаты гэтай праверкі, за аўладаньне вышынямі баявой падрыхтоўкі мабілізавана зараз уся энэргія, увесь рэвалюцыйны энтузіязм байцоў і кампалітскладу дывізіі.

«Страляць па - варашылаўску, даць на менш 100 проц. выкананьня стрэлковых задач, заваяваць пярэдніцтва ў БВА» — пад гэтымі лёзунгамі праводзіцца работа на аснове шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Пачынаючы са студзеня, паміж часьцямі дывізіі ідзе неаслабная барацьба за сьцяг шэфа — маскоўскага гіганта — заводу **шарыкападшыпнікаў імя тав. Л. М. Кагановіча.** Хто заваюе гэты сьцяг — вырашыць жнівеньская інспэктарская праверка.

* * *

Гераічная барацьба на франтох грамадзянскай вайны, бліскучыя перамогі над ворагамі пралетарскай дыктатуры — такое слаўнае мінулае 5-ай дывізіі.

У гады мірнага будаўніцтва, бурнага разьвіцьця сацыялістычнай народнай гаспадаркі нашай краіны — 5-я дывізія стаіць цьвёрда, непахісна на варце заваёў Кастрычніка. Гэта — адна з магутных, балвых калён узброенай апоры СССР, які ўпэўнена ідзе па шляху пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

5-я дывізія першай ва ўсёй РСЧА атрымала ганаровую назву ўдарнай. Яна праслаўлена сваімі посьпехамі ў баявой і палітычнай вывучцы, сваёй жалезнай рэвалюцыйнай дысцыплінай, аснаванай на высокай клясавай сьвядомасьці.

На інспэктарскай праверцы палітзаняткаў часьці 5-й ударнай паказалі лепшыя вынікі. Пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, апошнія пастановы партыі і ўраду аб збожжазагатоўках, жывёлазагатоўках, калгасным гандлі, аб уборачнай кампаніі шырока папулярызуюцца ў чырвонаармейскіх масах. І ня толькі ў чырвонаармейскіх масах. Праз лісты да дому, да сваякоў чырвонаармейцы мабілізуюць па выкананьне гэтых пастаноў масы калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Наколькі вялікая палітычная сьвядомасьць байцоў дывізіі, паказваюць вынікі падпіскі на пазыку «Чацьверты заключны». Кантрольная лічба перавыкананa, эвыш чым на 50 проц. Замест 200.000 руб., вызначаных заданьнем, у дывізіі рэалізавана пазыкі на суму 305.000 руб.

* * *

На працягу раду год 5-я ўдарная займала першае месца ў БВА па стралковай падрыхтоўцы. Яна паказвала лепшыя ўзоры, як трэба змагацца за дзейнасьць кожнага стрэлу, за спайпэрства, за варашылаўскі стрэл.

І вось, за апошні час у гэтай галіне вучобы стварылася пэўнае адставаньне. На інспэктарскай стралковай праверцы, якая адбылася ў канцы мая, побач са многімі падразьдзяленьнямі, якія бліскуча выканалі стральбу (станкісты 2-ай кулямётнай роты 13-га стралковага палка — 93 проц.), 2-я кульрота 15 С. П. — 100 проц. і г. д.), рад падразьдзяленьняў даў нізкія паказальнікі выкананьня. Гэта было вынікам ня досыць выстарчальнай падрыхтоўкі да стральбы ў даных падразьдзяленьнях.

Камандаваньне, партыйная і камсамольская арганізацыі дывізіі неадкладна ўзьялі на ліквідацыю адставаньня ў стральбе ўсю масу байцоў, кампалітскладу, усіх камуністаў і камсамольцаў у першую чаргу.

Дывізійная шматтыражка «Готовь победу» з нумару ў нумар дае ацэнрацыйны матар'ял аб ходзе стралковай падрыхтоўкі ў часьцях. Яна арганізуе байцоў, асьвятляе, выкрывае ўсе недахопы на заняткох, на стрэльбішчах, вучыць, як трэба аўладаць мастацтвам добра страляць.

Яна паказвае вопыты лепшых падразьдзяленьняў, лепшых камандзіраў, лепшых байцоў. А іх у РСЧА нямала — іх сотні, тысячы, дзесяткі тысяч...

Вось камандзір адзьзяленьня 15 стр. палка — камсамолец **тав. Агнёў.** Яго добра ведаюць ня толькі ў палку, ня толькі ў дывізіі, але і ва ўсёй БВА і нават ва ўсёй РСЧА.

Гэта ён, як лепшы з лепшых, атрымаў адзін з пяці ва ўсёй РСЧА гасьцявы білет на XVII усесаюзную канфэрэнцыю ленінскага камсамолу.

Гэта ён па ўсесаюзным камсамольскім стралковым конкурсе заняў першае месца. Гэта ён атрымаў першую прэмію на ўсеармейскім конкурсе па ўладаньні тэхнікай.

Тав. Агнёў — сакратар лепшай у палку камсамольскай ячэйкі, якая за цэлы год ня мае ніводнага дысцыплінарнага ўчынку. Ён — лепшы ручны кулямётчык, у яго адзьзяленьні ўсе байцы страляюць толькі на адпоўкі «отлично» і «добра».

Такіх Агнёвых у нас шмат і барацьба ідзе за тое, каб па іх раўняліся ўсе байцы дывізіі.

Барацьба за ліквідацыю адставаньня ў стралковай справе праходзіць у дывізіі пасьпяхова. Аб гэтым красамоўна гавораць весткі са стрэльбішчаў, са стралковых заняткаў. Другі разьдзел 3-й кулямётнай роты выканаў 6-ю задачу на 146 проц., у тым ліку камуністы і камсамольцы — на 150 проц. Лічбы гавораць самі за сябе.

У сваёй барацьбе за лепшыя паказальнікі па стральбе 5-я ўдарная скарыстоўвае лепшы вопыт і іншых часьцей. Стаўропальскі чырвонасьцяжны кавалерыйскі полк зьвярнуўся праз газэту «Красноармейская правда» з лістом, у якім байцы дзеляцца з 5-й ударнай дывізіяй сваім лепшым вопытам у стралковай справе. У адказ стаўропальцам ударнікі 5-ай яшчэ больш думмапілі стралковую падрыхтоўку, дэталёвае вывучэньне курсу стрэльб 1932 году і абавязаліся да жнівеньскай інспэктарскай праверкі дабіцца лепшых паказальнікаў у стральбе, поўнага выкананьня стралковых задач.

Гэта абавязацельства 5-я ўдарная, бязумоўна, выканае.

С. ГАЛКІН.

Эстрадна-цыркавыя паказы „Мюзік-Хол"

Музычныя эксцэнтрыкі Фэроні і сатырык Матаў з цьвёрдай упэўненасьцю сьцьвярджаюць, што «КАЛІ МЕНСКАЯ ПУБЛІКА ЗАПЛАЦІЛА ГРОШЫ, ДЫК АБАВЯЗКОВА ВЫСЯДЗІЦЬ УЖО ДА КАНЦА І МОЖНА СЬМЕЛА ПРАЦЯГВАЦЬ НА СЦЗКЕ ЎСЯКУЮ ХАЛТУРУ».

Матаў у сатыры «Чарнільнае балота» проста выходзіць за межы эстраднага майстэрства. У жаданьні трымаць больш цесны кантакт паміж залай і эстрадай, Матаў вядзе «разгаворчык» з публікай прыкладна такога характару — «МНЕ ТРЭБА ЗАРАБІЦЬ ДЗЯЦІШКАМ НА МАЛАЧЫШКА, ТАМУ Я І ТРУЛЮЛЮКАЮ, АЛЕ ВОСЬ ВЫ... З ЯКОЙ ЛАСЛЮЛЮКАЮ, ЯКІ ВЫ... ХІ-ХА-ХА... ХО-ХО-ХО, ХА-ХА-ХІ». ЧУЛІ СЛУХАЕЦЕ ЎСЮ ГЭТУ БУЗУ...

Мы-бы прайшлі імя гэтых прытупленых «шпілек» для публікі аджыўшых «рыхых», калі-б яны ня мелі некаторых адносін да кіраўніцтва «Мюзік-Хол».

Стварэньне ў Менску «Мюзік-Хол» зьяўляецца бязумоўным паказальнікам непераўнага росту савецкага мастацтва ў БССР, заслугоўвае самай вялікай увагі і падтрыманьня.

Ні адзін Менскі тэатр ня можа пахваліцца такімі зборамі, як «Мюзік-Хол». На яго падае найбольшае наведваньне працоўных сталіцы. Гэта тлумачыцца ростам нашай агульнай культурнасьці і цягай да савецкай эстрады, да так званых малых форм, а па другое і летнім характарам тэатру, у якім «Мюзік-Хол» працуе. Злоўжываць гэтымі прычынамі было-б злачынна і сьмешна. Цягу працоўных да эстрады трэба замацаваць задавальненьнем іх узросшых запатрабаваньняў.

За апошнія гады на савецкай эстрадзе адбыліся значныя зрухі. Лепшым доказам таму зьяўляюцца і сёлетнія паказы менскага новастворанага «Мюзік-Холу», іх якасны рост у параўнаньні з падобнымі паказамі мінулых гадоў.

Але гэтыя якасныя зрухі зьяўляюцца зусім МАЛЫМІ І НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМІ. Яны ні ў якай ступені НЕ ПАКРЫВАЮЦЬ патрэб нашага новага рабочага, не арганізуюць і ня выхоўваюць масы працоўнага гледача.

Возьмем цяперашні, ЧАЦЬВЕРТЫ цыкл паказаў. Ёсьць асобныя надзвычай добрыя нумары. Манапёр ПЭРСІЯНІНАВА, размова з г. Рэмаркам, аўтарам кніжкі «На захадзе без перамен» даходзіць да публікі, захапляе і хвалюе. Скетч ХОЛАДАВА І АЛЬТУС, артыстаў Ленінградзкага «Чырвонага Тэатру» — кусок рэчаіснасьці, выяўленьне ў арыгінальнай форме росту аульнай дзяўчыны — цікавы, вясёлы, выклікае шмат здаровага смеху, і разам з тым багаты па зьмесьце. Вядомы ўжо менскаму слухачу нумар «ОРДЭН» Бязьменскага (вык. НІШАЛЬСКАЯ). Выступленьні маладых гімнастаў з складанымі паветранымі нумарамі бяз усякай забясьпечанай сеткі робяць моцнае ўражаньне, паказваюць вялікі рост савецкай фізкультуры.

У папярэдніх цыклах заслужана карысталіся вялікай увагай выступленьні ансамблю гусьляроў, заслужанай артысткі Шчарбіна-Башырынай і інш.

У цэлым-жа НАША ЭСТРАДА ЯШЧЭ БЕДНА ІДЭЙНА І МАСТАЦКІ. Да стварэньня твораў для малых форм ня прыцягнуты лепшыя аўтарскія сілы. У большасьці скарыстоўваецца стары матар'ял, які часам не дае нічога «ні розуму, ні сэрцу». На эстрадзе зусім мала выступаюць нашы прызнаныя майстры савецкай музыкальнай і тэатральнай культуры.

У прыватнасьці, у БССР зусім ігнаруецца разьвіцьцё эстрады і малых форм. Тут, у нас фактычна АМАЛЬ НІЧОГА НЯМА. Дзяржаўны ансамбль народных інструмантаў, беларускі і яўрэйскі квартэт... і ўсё. Нельга не абурацца супроць таго факту, што беларуская тэатральна - мастацкая арганізацыі за ўсё лета далі для праграмы «Мюзік-Хол» толькі выступленьні вакальнага квартэту (ЛОТКЕР, МІКАЛАЕВІЧ, ШВАЙКО, ПІГУЛЕЎСКІ). Мы маем права патрабаваць ад Гапоўмастацтва і другіх арганізацый значка БОЛЬШАЙ УВАГІ да разьвіцьця ў БССР эстрады і малых форм.

Эстрада мае шырокія магчымасьці для выкарыстаньня сьмешнага, камэдыйнага і сатырычнага матар'ялу. Яна найбольш прыстасавана да выхаваньня гледача ўхмылкаю і сьмехам. Але мы супроць беспрадметнага, голага, зьбітага «абсьмешваньня» эстрадных жанраў, супроць зьбядненьня ідэйнасьці матар'ялу.

Да работы над малымі формамі і эстраднымі нумарамі трэба прыцягнуць лепшых паэтаў, сатырыкаў, драматургаў, кампазытараў, рэжысэраў. Савецкая эстрада павінна стварыць сотні новых савецкіх нумароў! Больш здаровага сьмеху, які-б выхоўваў гледача, зьні шчаў «сучкі» нашай багатай рэчаіснасьці. У нас часта атрымліваецца такое становішча, калі эстраднік надрываецца робленым сьмехам, а ў публікі зьяўляецца толькі яму спачуваньне. Гэта з прычыны нізкай культуры, сатырычных і камэдыйных нумароў эстраднага мастацтва. Хоча сьмяцца гледач і не заўсёды гэты сьмех можа быць выклікан сьмехам актора...

Кіраўнікі «Мюзік-Хол» адкрыта не заяўляюць, што «калі прошы заплацілі, дык высядзяць». Але нашта ад гэтага Матаўскага «сьмешнага» ў іх практыцы ёсьць. Трэба паэстрадзе менскага «Мюзік-Холу» часьцей паказваць узоры савецкага эстраднага мастацтва. Працоўны гледач мае права сказаць, што «каму шмат дано, ад таго многа і папрошуць». «Мюзік-Хол» абавязан «аплачваць» ня толькі купленыя білеты, але (І Ў ГЭТЫМ ЯГО ПРОСТЫ АБАВЯЗАК) узросшыя запатрабаваньні і культурныя патрэбы працоўных мас.

Дз Б—ЧЫК.

ПАВОДКА Ў КІТАІ

Кантон затоплен

ШАНХАЙ, 1. Паводле паведамленьняў агенцтва «Юнайтэдт Прэс», у выніку моцных дажджоў, Кантон затоплен. **600 дамоў зьнесена вадой.** Загінула 500 чал. Ва ўсходняй частцы правінцыі Шэнсі ў выніку разьліву рэкі Хуанхе затоплена звыш 30 вёсак. 30.000 сялян засталіся бяз даху над галавой. Паведамляюць, што паводкай ахоплены раёны, якія знаходзяцца ля вялікага каналу.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАДВОДЗІМ ВЫНІКІ КОНКУРСУ „ПРАВДЫ"

4-га жніўня у памяшканьні Дому Пісьменьніка адбудзецца

ЗАКЛЮЧНАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ

КАМІСІІ ПА КІРАЎНІЦТВЕ КОНКУРСАМ „ПРАВДЫ"

На пасяджэньне запрашаюцца ўсе члены цэнтральнай конкурснай камісіі БССР, работнікі цэнтральных газэт, прадстаўнікі Наркамзему, Калгасцэнтру, ЦСПСБ, ЦК саюзаў, рэдактары фабрычна-заводзкіх шматтыражак гор. Менску, члены рэдакалегій насьценных газэт і рабкоры, прадстаўнікі парт'ячэек і фабзаўмясцкомаў, асьветнікі і ІТР.

Пачатак а 6 гадз. увечары.

Цэнтральная камісія па кіраўніцтве конкурсам пры «Зьвязьдзе».

5-VIII у 7 гадзін веч. у памяшканьні рэдакцыі газэты „Зьвязда" адбудзецца

АДКРЫТЫ АГУЛЬНЫ СХОД

партколектыву цэнтральных газэт

з парадкам дня:

Даклад аб юбілею газэты „Зьвязда". Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова. Запрашаюцца і беспартыйныя.

Летні тэатр саду "Прафінтэрн"

„МЮЗІК-ХОЛ" бы-цыкль

Падвойная праграма.

СЁНЬНЯ І ШТОДЗЕННА

гастролі Ленінградзкага дзяржаўнага (б. Марыінскага) балету з удзелам прем'еру Г. А. Траяноўскай і М. М. Міхайлава, артысты сялісты В. П. Волкавы, С. Е. Падве, М. Е. Атрафіновіч, Г. Н. Казлова, В. М. Праабражэнскага, К. А. Жураўлёва. Усю праграму суправаджае сымфанічны аркестр пад кіраўніцтвам дырыжэра дзяржаўнага тэатру оперы і балету М. П. Карпаева.

Артысты Ленінградзкага тэатру дзярждрамы Т. А. Глебава і Г. І. Барысаў, М. Е. Ляніцкага ў выкананьні п'есы „Шутка" ў адным акце, А. П. Чэхава—„Медведь", Барэліовіч—жанглер, Тупіцын—эквілібрыст. Патроўскі—вакаліст, Рабічава—сьпевы, скетчы—„Шутка за коны быт" у выкананьні арт. Глебавай і Ляніцкага.

На раялю Дыдрыхс.

Пачатак у 9 гадзін вечара.

Білеты прадаюцца ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 гадз.

І ў касе тэатру з 6 з пал гадз. веч.

Дзеці да 16 год не дапускаюцца. Прымаюцца калектыўныя заяўкі на спэктаклі.

Чырвоная Зорка — Сёньня і штодзенна Пуцеўка ў жыцьцё

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Усходні мастацкі фільм ЧАДРА. Звыш праграмы хроніка Саюзкіно.

Кіно „Пралетары" — Мастацкі фільм БУХТА СЬМЕРЦІ драма ў 7 ч. Звыш праграмы хроніка Саюзкіно. Дзённыя дзіцячыя сэансы КАНЕЦ ДЭЗЕРАГІНА Звыш праграмы хроніка Саюзкіно

СПАРТАК — Мастацкі фільм РУБІКОН драма ў 7 частках

Менскі Архітэктурна-будаўнічы сельска-гаспадарчы тэхнікум

АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ студэнтаў на 1-шы курс

Прымаюцца асобы не маладзей 16 год.

Тэрмін навучаньня 3 гады.

Да паступаючых патрэбуюцца веды ня ніжэй сямігодкі. Заявы прымаюцца да 20 жніўня. Да заявы павінны прыкладацца дакументы (абавязкова ў арыгінале) аб адукацыі, аб узросьце, аб сацыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, аб вытворчым стажы паступаючага, аб адносінах да ваеннай павінасьці, анкету завераную савецкімі, партыйнымі або прафэсыянальнымі арганізацыямі, даведку аб здароўі, дзьве завераныя фота-карткі, паштовых марак на 30 кап. Ступень забясьпечваюцца стыпэндыяй, згодна пастановы СНК СССР ад 7 ліпеня 1932 г. Інтэрнатам забясьпечваюцца ўсе прыяжджаючыя. Пачатак заняткаў 1 кастрычніка. Заявы накіроўваць па адрасе: Менск, Савецкая, 113, архітэктурна-будаўнічы сельска-гаспадарчы тэхнікум.

Дырэктар тэхнікуму М. Жаўрыц.

БЕЛВОДТРЭСТ

прыступае да складаньня кантрольных лічбаў на 1933 г. па пабудове сьвідравальных шыхлін, водаправодаў, вышуканьні і складаньні праектаў з мэтай водазабесьпячэньня саўгасаў, калгасаў і інш. устаноў. Белводтрэст просіць усе зацікаўленыя арганізацыі даслаць свае заяўкі не пазьней 15 жніўня 1932 г.

Тыя, што не прадставілі заявак ня будуць уключаны ў плян работ 1933 г.

Заяўкі даслаць па адрасе: Менск, Старажоўская, 11, Белводтрэст.

МЕНСКІ МЭДПАЛІТЭХНІКУМ

з 15-VI па 1-IX—1932 г. НАБОР студэнтаў абвяшчае новы на 1-я курсы ў ліку 250 асоб, якія разьмяркоўваюцца па наступных аддзяленьнях:

Санітарнае аддзяленьне (дзённае)—50 асоб
" (вячэрняе)—20 "
Зубное аддзяленьне (дзённае)—30 "
" (вячэрняе)—30 "
Аддзіна дыспансэрнае аддз. —60 "
Аддзяленьне акушэрскае —50 "
акушэр дзяцей і падлеткаў —30 "

Патрэбныя дакументы, згодна даведніку для паступаючых у ВНУ і тэхнікумы.

Заявы накіроўваць па адрасе: Менск, Першамайская, 7, Мядтэхнікуму.

дырэкцыя.

Менскі Гарадзкі Савет

Менкамгас паведамляе, што 4 жніўня, у 18 з пал. гадз. склікаецца

НАРАДА

ўсіх трыкутнікаў камунальных прадпрыемстваў, падпарадкаваных Менкамгасу

(жылтрэст, вадаканалтрэст, трапепартрэст, электрастанцыя, гужпарк, кар'ерныя работы, асабоз, кір. гасьцініц, лазьні і інш., буд. к-ра, трэст зялёных насаджэньняў, пажарная охова), а таксама запрашаюцца: прадстаўнік ЦК саюзу камунальн. прадпрыемстваў, Нач. Менгарміліцыі, старшыня камунальнай сэкцыі, прадстаўнік вадатрэсту НКЗБ, дырэктар санітэхбуду, дырэктар бэтоннага заводу.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Аб задачах правядзеньня месячніка дабрабыту на аснове пастановы Гаркому КП(б)Б і пленуму Менгарсавету (дакл. т. Гейлёрман).

2) Аб структуры абслугоўваньня камунальнай гаспадаркі.

Нарада адбудзецца ў памяшканьні клюбу вольна-пажарнага т-ва (Рэспубліканская вул.).

Менкамгас.

Чэрыкаўскі вэтэрынарны тэхнікум абвяшчае асеньні набор

на 1-шы курс тэхнікуму ў колькасьці 60 асоб і на 10-месячныя ветфэльчарскія курсы таксама ў колькасьці 60 асоб.

У тэхнікум прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме сямігодкі, а на 10 месячныя ветфэльчарскія курсы з адукацыяй у аб'ёме 5-6 груп сямігодкі.

Студэнты і курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй.

Да заяў далучаюцца дакументы аб сацыяльным становішчы, асьвеце, узросьце і здароўі.

Заявы па першы курс тэхнікуму прымаюцца да 1-га верасьня, а на 10 месячныя ветфэльчарскія курсы да 15-га жніўня. Заняткі на 1 курсе—з 1-га кастрычніка, а на 10-месячных з 1 верасьня. Дакументы накіроўваюцца на адрасе: г. Чэрыкаў, Ветэхнікуму.

Дырэкцыя.

БЕЛАРУСКІ ТАВАРАЗНАЎЧЫ ІНСТЫТУТ

абвяшчае асеньні набор студэнтаў

1. На тавараязнаўчае аддзяленьне па спэцыяльнасьці: а) тавараведаў па малаку - маслу—30 чал., б) тавараведаў па плодагародніне—60 чалавек.

2. На плянава-эканамічнае (вячэрняе без адрыву ад работы) па спэцыяльнасьцях: а) эканамістаў плянавікоў—30 чалавек, б) эканамістаў па сацыялістычнаму вучоту—30 чалавек.

Інстытут рыхтуе высока-кваліфікаваных тавараведаў у галіне пераапрацоўкі і савецкага гандлю для работы ў цэнтральным апараце малочна-масьлянага і плодагароднага аб'яднаньня Белкавапсаюзу, у спэцыяльных трустах і на буйных базах і складах спажыўсыстэмы.

Аддзяленьне па плянаваньні і вучоту рыхтуе высока-кваліфікаваных спэцыялістаў для апарату Белкавапсаюзу і яго аб'яднаньняў. На гэта аддзяленьне прымаюцца пераважна працаўнікі Спажыўсыстэмы з адпаведным практычным стажам работы па плянаваньні і вучоту.

Адначасова ўтварэцца набор на 3 курс дзённага і на 4-ты курс вячэрняга аддзяленьня рабфаку пры самім інстытуце і яго філіялах: у Віцебску пры кааптэхнікуме (Валадарскага, 27), у Бабруйску пры Кааперацыйнай школе (Сацыялістычная, 128) і ў Гомелі пры тэхнікуме грамадзкага харчаваньня (Ляшчынская, 1).

На першы курс інстытуту прымаюцца асобы, маючыя заканчанную сярэднюю асьвету (рабфак, тэхнікумы, 9-годкі). На трэці курс дзённага і на 4-ты курс вячэрняга Рабфаку прымаюцца рабочыя і калгаснікі з ведамі ня ніжэй 7-8 груп сярэдніх школ.

Студэнты дзённых курсаў ня Інстытуту, так і Рабфаку забясьпечваюцца стыпэндыяй і іншага роднёй—інтэрнатам, або кватэрнымі грашыма. Студэнты вячэрніх курсаў стыпэндыяй і інтэрнатам не забясьпечваюцца.

Заявы з анкетамі і дакумэнтамі, згодна правіл паступаючых у ВНУ і Рабфакі, прымаюцца да 1-га верасьня па адрасе: г. Менск, Унівэрсытэцкі гарадок